Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

15 СНЕЖНЯ 2006 г.
ПЯТНІЦА
№ 267 (25856)

Кошт 360 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Наша газета ўключана ў «Залаты фонд прэсы» СНД

ДА ЧЫТАЧА!

Газета павінна не толькі прыходзіць, але і... прыязджаць

Сёння, 15 снежня, Дзень падпісчыка «Звязды» адбудзецца ў Доме культуры в. Рагозніца Мастоўскага раёна, дзе, мусіць, зачакаўся свайго 2-камернага «Атланта» Іван Вікенцьевіч Новік. Пачатак сустрэчы ў 12 гадзін. Бліжэй да 16-ці маленькі звяздоўскі дэсант прыбудзе ў Ляхавічы. Там, у актавай зале райвыканкама будзе ўручаны каляровы «Віцязь» Тамары Іванаўне Козел. Апроч гэтага ў праграме сустрэч знаёмствы, расказы пра газету і яе калектыў, прэзентацыя кнігі Валянціны Доўнар «Праз каханне» і фотаальбома Анатоля Клешчука (у сааўтарстве...) «Чарнобыль», віктарына і розыгрыш прызоў драбнейшых, байкі са скарбонкі народнага гумару...

Так што прыходзьце!

Валянціна ДОЎНАР, Інга МІНДАЛЁВА, Уладзімір ЗДАНОВІЧ, Яўген ПЯСЕЦКІ.

Пасяджэнне ВДС пройдзе сёння ў Маскве пад старшынствам Аляксандра Лукашэнкі

Старшыня Вышэйшага Дзяржаўнага Савета (ВДС) Саюзнай дзяржавы, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сёння ў Маскве прыме ўдзел у пасяджэнні ВДС.

На разгляд ВДС выносіцца шэраг пытанняў, у тым ліку тых, што датычацца выканання рашэнняў Вышэйшага Дзяржсавета, узаемадзеяння ў галіне знешняй палітыкі, бюджэту Саюзнай дзяржавы на 2007 год і рэалізацыі саюзных праграм. Плануецца, што ў ходзе візіту адбудзецца таксама двухбаковая сустрэча прэзідэнтаў Беларусі і Расіі, на якой Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін абмяркуюць актуальныя аспекты двухбаковага ўзаемадзеяння.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Сустрэча прэзідэнтаў Беларусі і Украіны можа адбыцца ў лютым-сакавіку 2007 года

Сустрэча прэзідэнтаў Беларусі і Украіны Аляксандра Лукашэнкі і Віктара Юшчанкі можа адбыцца ў Чарнобылі ў лютым-сакавіку 2007 года, заявіў учора кіраўнік Сакратарыята прэзідэнта Украіны Віктар Балога ў час сустрэчы з кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Генадзем Нявыгласам.

Віктар Балога падкрэсліў, што пасля нядаўна праведзенай сустрэчы ў Кіеве з Генадзем Нявыгласам ён праінфармаваў аб выніках перагавораў прэзідэнта Украіны Віктара Юшчанку. Украінскі лідар сказаў, што трэба тэрмінова ехаць у Беларусь, умацоўваць двухбаковыя адносіны, а таксама што ў дзвюх краін вельмі шмат агульнага. На думку ўкраінскага боку, з Беларуссю склаліся добрыя дружалюбныя, добрасуседскія адносіны, але шмат праблем, якія патрабуюць вырашэння.

Віктар Балога падкрэсліў: «Мы разгледзім пытанне аб візіце Прэзідэнта Беларусі ва Украіну. Аб гэтым мы гаварылі ў час сустрэчы ў Кіеве. Напэўна, мы будзем планаваць візіт прыкладна на люты-сакавік 2007 года». Паводле яго слоў, чарнобыльская праблема — гэта праблема і Украіны, і Беларусі, і ўсяго еўрапейскага супольніцтва.

Другі блок пытанняў, якія ўкраінскі госць плануе абмеркаваць ў Мінску, — гэта ўкараненне новых тэхналогій па будаўніцтву палацаў спорту, па развіццю хакея. «Усё тое добрае, што ёсць у гэтым напрамку ў Беларусі, мы прывядзём ва Украіну і будзем разам з вашымі будаўнікамі развіваць», — адзначыў Віктар Балога.

Увядзенне Расіяй мытных пошлін на нафту для Беларусі парушае шэраг дзеючых пагадненняў

Увядзенне Расіяй мытных пошлін на нафту для Беларусі парушае шэраг дзеючых пагадненняў, якія вызначаюць рэжым свабоднага гандлю без канфіскацый і абмежаванняў паміж дзвюма краінамі, у прыватнасці, пратакол ад 6 студзеня 1995 года аб увядзенні рэжыму свабоднага гандлю без канфіскацый і абмежаванняў паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй. Аб гэтым заявіў учора, адказваючы на пытанні журналістаў, прэс-сакратар Міністэрства ўнутраных спраў Андрэй Папоў.

Увядзенне пошлін на нафтапрадукты не павінна сур'ёзна паўплываць на развіццё АПК

Такую думку выказаў намеснік прэм'ер-міністра краіны ў інтэрв'ю карэспандэнту БЕЛТА. У пэўнай меры, адзначыў ён, народная гаспадарка Беларусі была гатова да такога сцэнарыя развіцця падзей. У сувязі з гэтым урадам былі прыняты адпаведныя апераджальныя меры, якія выліліся ў сістэмную і сур'ёзную работу па энергазберажэнню. Цяпер гэтай рабоце будзе надавацца выключная ўвага, як і пытанням зніжэння сабекошту сыравіны ў складзе прадукцыі, што вырабляецца, зніжэння затрат на адзінку выпушчанага прадукту.

С. Гайдукевіч стаў спецпрадстаўніком кіраўніка МЗС па ўзаемадзеянню з еўраструктурамі

Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Сяргей Мартынаў 14 снежня назначыў дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Сяргея Гайдукевіча спецыяльным прадстаўніком міністра замежных спраў Беларусі па ўзаемадзеянню з еўрапейскімі парламенцкімі структурамі.

Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў МЗС, Сяргей Гайдукевіч захоўвае свае дэпутацкія паўнамоцтвы і прадаўжае займацца палітычнай дзейнасцю. Назначэнне на гэты важны напрамак аднаго з лідараў канструктыўнай апазіцыі, былога кандыдата ў прэзідэнты Беларусі з'яўляецца сведчаннем адкрытасці беларускіх уладаў да ўзаемадзеяння з усімі канструктыўнымі палітычнымі сіламі і грамадзянскай супольнасцю ў цэлым.

Кар. БЕЛТА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЖЫВЫЯ КАМЕНЬЧЫКІ

Людзей, якія разумеюць душу і прыгажосць каменя, адносяць да ліку незвычайных. Сапраўдных калекцыянераў мінералаў і самацветаў у Беларусі можна пералічыць па пальцах адной рукі. Жыхар Брэста Яўген Сказін (на фотаздымку) ахвотна бярэ ўдзел у мінералагічнай выстаўцы «Каменная казка», якую штогод арганізуе геаграфічны факультэт Белдзяржуніверсітэта. Яго прыватная калекцыя, якая пачала фарміравацца больш як 20 гадоў таму, магла б зрабіць гонар любому музею. У гэтыя дні, дзякуючы такім калекцыянерам, як Я. Сказін, ёсць магчымасць патрымаць у руках «жывы» малахіт і горны хрусталь, лазурыт, радаміт, бурштын, убачыць незвычайныя формы крэменю, знойдзеныя на беларускай зямлі.

Зніклыя па ўласнаму жаданню

Як паведаміў падчас сустрэчы з журналістамі міністр унутраных спраў Беларусі Уладзімір Навумаў, штогод у нашай краіне аб'яўляюцца ў вышук крыху больш за тысячу чалавек, з якіх толькі каля 70 не ўдаецца знайсці. Прычым, паводле слоў кіраўніка МУС, палову прапаўшых складаюць асобы, якія і самі не жадаюць, каб іх знайшлі. Жывуць дзесьці на нелегальным становішчы і не нагадваюць аб сабе родным і блізкім. Другую палову складаюць людзі, якія, паводле меркавання міністра, хутчэй за ўсё, сталі ахвярамі злачынцаў. Знікаюць беларускія грамадзяне ў самых розных жыццёвых сітуацыях. Але найчасцей падчас выезду на заробкі ў Расію і іншыя краіны СНД.

Зараз, паводле інфармацыі міністра, ад беларускага правасуддзя хаваюцца за мяжой некалькі соцень парушальнікаў закона, у тым ліку і дзесьці 140—170 гэтак званых «аліментшчыкаў. Апошнія звычайна знаходзяць прытулак у Расіі. У бліжэйшы час хуліцца ад выплаты аліментаў нядобрасумленным бацькам будзе значна цяжэй. Уладзімір Навумаў, напрыклад, паведаміў, што неўзабаве з краін Еўрасаюза будуць экстрадзіраваны двое грамадзян, якія знаходзіліся ў вышуку з 1995 года. Гэтыя асобы, паводле слоў міністра, праходзяць па «гучных справах», звязаных з невяртаннем крэдытаў.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

У Міністэрстве працы і сацабароны прыём будзе арганізаваны і па суботах

У Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, а таксама ў падпарадкаваных яму арганізацыях прыём грамадзян будзе ажыццяўляцца і па суботах з 10 да 13 гадзін. Яго будуць весці па зацверджанаму графіку кіраўнікі і намеснікі кіраўнікоў структурных падраздзяленняў, паведаміла карэспандэнту БЕЛТА прэс-сакратар міністэрства Галіна Трафіменка.

Паводле яе слоў, у міністэрстве першы суботні прыём грамадзян адбудзецца ўжо ў бліжэйшую суботу 16 снежня.

Галіна Трафіменка нагадала, што ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны прыём грамадзян па асабістых пытаннях арганізаваны ў рабочыя дні (без папярэдняга запісу) — з панядзелка па пятніцу ўключна, на працягу ўсяго рабочага дня. Прыём грамадзян па суботах арганізуецца ў такіх арганізацыях міністэрства, як РУП «Беларускі пратэзна-артапедычны аднаўленчы цэнтр» (г. Мінск), Рэспубліканскі інтэрнат ветэранаў вайны і працы (п. Ждановічы-1), Рэспубліканскі рэабілітацыйны цэнтр для дзяцей-інвалідаў (г. Мінск), а таксама ў чатырох санаторыях для ветэранаў вайны, працы, інвалідаў — «Бярэзіна» (г. Барысаў), «Белая Вежа» (Камянецкі раён Брэсцкай вобласці), «Вяжуці» (Маладзечанскі раён), «Ясельда» (Пінскі раён).

ЦІ ЗРОБІЦЬ ІПАТЭКА БОЛЬШ ДАСТУПНЫМ ЖЫЛЛЁ?

Учора дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі прынялі ў першым чытанні законапраект «Аб іпатэцы».

Як паведаміў першы намеснік міністра эканомікі Пётр Жабко, законапраект «Аб іпатэцы» абагульняе асноўныя прававыя нормы іпатэчных праваадносінаў і рэгулюе закладовыя адносіны, аб'ектам якіх з'яўляецца нерухомая маёмасць. Паводле яго слоў, «выдача і карыстанне закладнымі павінны здзяйсняцца пад кантролем дзяржавы, што знайшло адлюстраванне ў законапраекце праз неабходнасць абавязковай дзяржаўнай рэгістрацыі закладных і пераходу правоў па іх».

Законапраект рэгулюе асаблівасці іпатэкі асобных відаў маёмасці. У прыватнасці, па дагавору аб іпатэцы могуць быць закладзены толькі тыя зямельныя ўчасткі, якія знаходзяцца ва ўласнасці грамадзян або юрыдычных асоб Беларусі. Іпатэка зямельных участкаў, што знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці, не дапускаецца. Іпатэка асобных будынкаў і збудаванняў будзе дапускацца толькі з адначасовай іпатэкай зямельнага ўчастка, які знаходзіцца ў прывятнай уласнасці і на якім знаходзіцца гэты будынак або збудаванне. Іпатэка жылых дамоў і кватэр прадугледжваецца ў адносінах да індывідуальных і шматкватэрных жылых дамоў і кватэр, якія належаць на правах уласнасці грамадзянам або юрыдычным асобам. Іпатэка жылля, якое знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці, забароненая. Перадаваць у іпатэку можна будзе кватэры і жылыя дамы толькі з пісьмовай згоды ўсіх паўналетніх членаў сям'і, якія там пражываюць, а таксама, калі гэта неабходна, з пісьмовага дазволу органаў апекі і папячыцельства.

П. Жабко адзначыў, што прыняцце законапраекта павінна «пашырыць магчымасць набыцця жылля грамадзянамі, стварыць базу для прыцягнення зберажэнняў насельніцтва ў жыллёвы сектар». Прычым асаблівасцю іпатэчнага крэдытавання будзе з'яўляцца «спрашчэнне працэдуры атрымання банкаўскіх крэдытаў грамадзянамі для набыцця жылля».

Аднак іпатэка для Беларусі не навінка. Ужо сёння грамадзяне нашай краіны будуюць жыллё пад заклад нерухомасці. І асноўнае пытанне, што ўзнікае падчас выкарыстання іпатэкі, лічыць дэпутат Анатоль Паўловіч, датычыцца велічыні працэнтнай стаўкі, пад якую бярэцца крэдыт. Таму, паводле яго слоў, магчымасць будаўніцтва жылля стане больш рэальнай тады, калі пад іпатэку крэдыт будзе выдавацца з больш нізкай стаўкай. У адказ П. Жабко адзначыў, «што праблема памяншэння працэнтнай стаўкі будзе вырашацца так, як і ў іншых краінах свету — шляхам будаўнічых зберажэнняў, калі насельніцтва аддае свае грошы ў банк, яны накапляюцца, і гэтыя грошы мінімальна каштуюць». Пакуль жа ў іпатэцы будзе прымяняцца стандартная рынкавая стаўка. Таму, лічыць намеснік міністра эканомікі, прыняцце законапраекта павінна стаць «адпраўной кропкай», а далей неабходна развіваць іншыя інстытуты, што працавалі б побач і дапамагалі вырашаць праблемы атрымання больш танных крэдытных рэсурсаў і будаўніцтва больш таннага жылля. З улікам росту рэальных грашовых даходаў, заявіў ён, «гэта праблема можа вырашацца».

Дарэчы, законапраект «Аб іпатэцы» рыхтаваўся дастаткова працяглы час. Як адзначыла дэпутат Валянціна Качан, адзін са стрымліваючых фактараў заключаўся ў тым, што не быў адпрацаваны механізм, які мог бы абараняць грамадзян, калі тыя па ўважлівых прычынах не змаглі б праз нейкі час расплачвацца па крэдыту, а таму іх неабходна высяляць. П. Жабко паведаміў, што «па вялікаму рахунку, калі мы гаворым аб тым, што побач з сацыяльнымі гарантыямі дзяржавы ўступаем у рынкавыя адносіны, то мы павінны і ў гэтай сітуацыі казаць аб рынкавых адносінах, г. зн. грамадзянін павінен разлічваць на свае сілы». У адпаведнасці з законапраектам, калі грамадзянін на працягу трох і больш разоў на працягу 12 месяцаў не выконвае сваіх абавязкаў па аплаце крэдыту, да яго можа прымяняцца працэдура адабрання іпатэчнага закладу. Пры такіх умовах справа перадаецца ў суд, які на працягу года разглядае пытанне і дае магчымасць грамадзяніну выканаць свае абавязацельствы».

Яшчэ адну праблему ўзняў дэпутат Уладзімір Здановіч. Ён адзначыў, што сёння будаўнікі не паспяваюць будаваць жыллё: попыт занадта вялікі, а прапановы нізкія. У такіх умовах, зразумела, цэны на жыллё могуць толькі павышацца. А таму, лічыць ён, з увядзеннем іпатэкі цэны могуць быць «яшчэ больш узвінчаны».

Учора дэпутаты Палаты прадстаўнікоў таксама прынялі законапраект «Аб органах унутраных спраў». Міністр унутраных спраў Уладзімір Навумаў паведаміў, што развіццё грамадскіх адносінаў патрабуе новых падыходаў да вызначэння ролі і месца міліцыі ў сістэме органаў унутраных спраў. Таму законапраект вызначае асноўныя паняцці, прапісвае абавязкі і правы супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, парадак і ўмовы прымянення імі фізічнай сілы, спецыяльных сродкаў зброі, баявой і спецыяльнай тэхнікі і г. д. Падчас абмеркавання законапраекта дэпутат Віктар Кучынскі спытаўся, чаму Беларусь не далучаецца да сусветных тэндэнцый і не пераймяноўвае міліцыянераў у паліцэйскіх. У. Навумаў адзначыў, што калі сярэдняе пакаленне ўжо нейтральна ўспрымае гэтыя дзве назвы, то ў старэйшага пакалення слова «паліцэйскі» выклікае негатыўную рэакцыю.

У першым чытанні таксама быў прыняты законапраект «Аб Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь». Як адзначыў старшыня Дзяржаўнага камітэта пагранічных войскаў Аляксандр Паўлоўскі, цяпер Беларусь завяршае дзяржаўнае афармленне дзяржграніцы на прыбалтыйскім участку і гатова правесці рэдэмаркацыю беларуска-польскага ўчастка мяжы, пачаць дэмаркацыю беларуска-ўкраінскага ўчастка, а таксама ўрэгуляваць зямельныя праваадносіны на ўчастку дзяржграніцы з Расіяй. У цэлым жа законапраект «не абцяжарвае грамадзян дадатковымі абавязкамі».

Таксама дэпутаты прагаласавалі па законапраекту «Аб процідзеянні экстрэмізму». Нагадаем, што ў кастрычніку гэтага года верхняя палата беларускага парламента адправіла яго на дапрацоўку з-за недакладнасцяў і мяккіх мераў адказнасці за экстрэмісцкую дзейнасць.

Сяргей КАРАЛЕВІЧ.

АСАБЛІВАСЦІ КРЫМІНАЛЬНАГА ПЕРАСЛЕДУ ДЭПУТАТАЎ І ЧЫНОЎНІКАЎ

Учора прайшло чарговае пасяджэнне сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, на якім сенатары разгледзелі 12 пытанняў.

У прыватнасці, члены Савета Рэспублікі адобрылі законапраект «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытанню крымінальнага пераследу асобных катэгорый грамадзян і іншых пытаннях крымінальнага працэсу». Дакумент, у прыватнасці, дапаўняе Крымінальна-працэсуальны кодэкс артыкулам, які рэгламентуе асаблівасці крымінальнага пераследу асобнай катэгорыі службовых асоб — суддзяў, дэпутатаў ПП НС, членаў СР НС, дэпутатаў мясцовых Саветаў, народных засядацеляў і пракурорскіх работнікаў. У гэты ж пералік увайшлі і чыноўнікі, якія ўключаны ў кадравы рэестр кіраўніка дзяржавы. Паводле законапраекта, узбуджэнне крымінальнай справы супраць дэпутата магчымае са згоды генеральнага пракурора, а супраць асобы, што ўключана ў кадравы рэестр кіраўніка дзяржавы, — толькі са згоды Прэзідэнта. Без гэтых умоў іх можна будзе затрымліваць толькі ў выпадку здзяйснення дзяржаўнай здрады або на месцы злачынства. Праводзіць жа аператыўна-пошукавыя дзеянні ў адносінах да іх магчыма будзе толькі са згоды генеральнага пракурора або асобы, што яго часова замяняе.

Таксама ўчора сенатары разгледзелі Дэкрэт Прэзідэнта «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у няўдалых сем'ях», змяненні ў закон «Аб пенсійным забеспячэнні» і інш.

Сяргей КАРАЛЕВІЧ.

КЛУБ ЗДАЎСЯ ЗБОРНАЙ

Днямі нацыянальная зборная Беларусі спаборнічала з адной з лепшых каманд Чэхіі, «Мелер» з Пардубіцэ, і перамагла ў таварыскай гульні — 3:1. У саставе беларусаў вызначыліся Максім Цвяткоў (магілёўскі клуб «Хімвалакно»), Аляксандр Кулакоў (мінскае «Дынама») і Андрэй Міхалёў (сталічны «Керамін»). Нагадаем, што ў матчы з галоўнай дружынай Чэхіі каманда Курта Фрэйзера прайграла — 0:2.

Ірына АНАТАВА.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

проводит открытый аукцион по продаже здания РБУ (общ. пл. 824, 4 кв.м), расположенного: г. Логойск, ул. Заводская, 36. Начальная цена снижена на 10% и составляет — 276 750 000 бел. руб. Полное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 21.09.2006 г. Аукцион состоится 29.12.2006 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 28.12.2006 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 322.

Контактные телефоны: (8017) 2246134, (801774) 55467.
Сайт в Интернете: www.rlt.by.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ШТАРМАВЫ ЦЫКЛОН ЗАКРАНЕ ВІЦЕБШЧЫНУ

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў Рэспубліканскім гідраметцэнтры, актыўны штармавы цыклон са Скандынавіі рухаецца на паўночны ўсход Расіі.

Не вельмі моцна ўдар стыхіі закране і нашу краіну. У пятніцу невялікі шторм зачэпіць Віцебскую вобласць, паўночную частку Мінскай і Гродзенскай абласцей. Сіла ветру ў гэтых рэгіёнах будзе трымацца на ўзроўні 15—20 м/с. На астатняй тэрыторыі краіны парывы ветру магчымыя да 14 м/с. Ужо ў суботу вецер супакоіцца, але на поўначы пройдуць дажджы. Тэмпература паветра ўначы плюс 1—7 градусаў, удзень — 4—9° цяпла. У нядзелю дажджы будуць ісці паўсюдна.

Сяргей КУРКАЧ.

РЫЭЛТАРСКАЯ КАНТОРА ДЛЯ НЕПЛАЦЕЛЬШЧЫКАЎ ЗА КВАТЭРУ

У Магілёве хутка адкрыецца новая рыэлтарская кантора, якая будзе прапаноўваць свае паслугі ў абмене большай жылой плошчы на меншую малазабяспечаным сем'ям і «хранічным» даўжнікам па кватэрнай плаце.

Ідэя стварыць такую кантору належыць Магілёўскаму цэнтру гарадскіх інфармацыйных сістэм, які займаецца налічэннем камунальных плацяжоў і спагнаннем запазычанасцяў.

— Ёсць сем'і альбо адзінокія людзі, якія маюць вялікія кватэры, але не маюць магчымасці плаціць за іх, — тлумачыць дырэктар Цэнтра інфармацыйных сістэм Юрый Капытаў. — Многія з іх, магчыма, і пагадзіліся б на пераезд у меншыя кватэры, але ў іх няма магчымасці і ахвоты займацца абменнымі клопатамі. Мы дапаможам гэтым людзям і дадзім гарантыю, што інфармацыяй пра іх фінансавыя праблемы не скарыстаюцца махляры.

Валодаючы інфармацыяй пра даўжнікоў па кватэрнай плаце, спецыялісты новай рыэлтарскай канторы прапануюць ім абмен. Аднак грошы за паслугі будуць браць не з малазабяспечаных, а з людзей з дастаткам, якія хочуць палепшыць свае жыллёвыя ўмовы і набыць кватэру з большай плошчай.

Мяркуецца, што з розніцы паміж коштам вялікай і малой кватэры будуць заплачаны запазычанасці кліента. Гэта дазволіць знізіць праблему неплацяжоў. Яна па-ранейшаму стаіць востра, нягледзячы на тое, што за апошнія 5 месяцаў яе ўдалося паменшыць амаль на мільярд рублёў. Цяпер у горадзе Магілёве больш за 5 тысяч плацельшчыкаў маюць запазычанасць за кватэру ў 2,6 мільярда рублёў.

Канешне, не ўсе даўжнікі захочуць абменьваць свае кватэры і ніхто не будзе іх прымушаць да абмену. Аднак у цэнтры ўжо вызначылі больш за сотню перспектыўных кліентаў, з якімі можна працаваць. Паводле планаў, «Рыэлтінфармцэнтр» — так будзе называцца новая кантора — пачне працаваць у пачатку новага года.

Ілона ІВАНОВА.

БЕЛАРУСЫ ЗАДАВОЛЕНЫ РАБОТАЙ МІЛІЦЫІ

Большасць беларусаў ацэньваюць дзейнасць міліцыі станоўча. Такая выснова вынікае з нядаўняга даследавання Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, праведзенага ў рамках Дзяржпраграмы па барацьбе са злачыннасцю.

Выказваючы сваё меркаванне аб рабоце беларускай міліцыі, большасць грамадзян — 60,2 працэнта — ацанілі яе як «здавальняючую». На думку насельніцтва, змяненні да лепшага найбольш заўважныя ў рабоце пашпартна-візавай службы. Пра гэта ў ходзе апытання заявілі 36,6 працэнта рэспандэнтаў. На пазітыўныя змяненні ў службовай дзейнасці ўчастковых інспектараў указалі 24,9 працэнта апытаных, ДАІ — 32,8 працэнта, аператыўна-дзяжурнай службы — 21,6 працэнта, інспекцыі па справах непаўналетніх — 21 працэнт удзельнікаў апытання. У параўнанні з вынікамі аналагічнага апытання, праведзенага ў 2000 годзе, работа органаў унутраных спраў, згодна з меркаваннямі беларусаў, значна палепшылася.

Сяргей ПРОТАС.

ПРЭТЭНДЭНТЫ НА «ЕЎРАБАЧАННЕ-2007» СТАНУЦЬ ВЯДОМЫЯ СЁННЯ

Учора ўвечары жараб'ёўка вызначыла, пад якімі нумарамі ўдзельнікі паўфінальнага адборачнага канцэрта «Еўрафэст» будуць выходзіць на сцэну Палаца Рэспублікі.

Такім чынам, сёння ў 19.20 адборачны канцэрт пачнецца ў наступным парадку:

1. Ганна Шаркунова, «Сорваться и вниз». 2. Гурт «Барнео», «Fingertips». 3. Дзмітрый Калдун, «Ангел мечты». 4. LENA, «Call me». 5. Гурт «Сваякі», «Салодкі мёдзік». 6. Ірына Ярына (Украіна), «Короткий дождь». 7. Гурт «Dali», «Мечтай со мной». 8. Наталля Тамела, «So badly high». 9. Гурт «Litesound», «Summer trip». 10. Гурт «The Project», «S.U.P.E.R. S.T.A.R.». 11. Алег Карпенка, «I feel good tonight». 12. Гурт «New Generation», «Беларусь». 13. Дыяна Гурцкая (Расія), «How long». 14. Наталля Лапцева, гурт «XXXLight» (Расія), «Tears». 15. Віктар Пшанічны, «Sooner or Later».

Журы ацэньвае выканаўцаў і галасуе ў студыі. Гледачам даецца роўна 10 хвілін, каб прагаласаваць за ўпадабанага выканаўцу па нумары 8-803-100-03-XX, дзе XX — нумар выканаўцы ад 01 да 15. Званок з гарадскіх тэлефонаў бясплатны, з мабільных — па тарыфах аператараў. SMS-галасаванне не будзе ўвогуле. Па выніках адбору стануць вядомыя імёны двух (або трох, калі меркаванне гледачоў не супадзе з думкай журы) фіналістаў, якія і будуць змагацца за пуцёўку ў Фінляндыю на «Еўрабачанне-2007».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

БЕЛИНВЕСТБАНК

ОАО «Белинвестбанк» сообщает, что 26 декабря 2006 г. ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ БАНКА В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ

В повестку дня внесены вопросы:

1. О принятии решения об увеличении уставного фонда банка.
2. Об утверждении решения о третьем выпуске простых акций ОАО «Белинвестбанк».
3. Об утверждении размера уставного фонда ОАО «Белинвестбанк» с учетом третьего выпуска акций банка.
4. Об утверждении изменений, вносимых в Устав ОАО «Белинвестбанк».
5. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
6. О процедурных вопросах.

Лица, имеющие право на участие в собрании (владельцы простых (обыкновенных) акций ОАО «Белинвестбанк»), желающие принять в нем участие, могут обратиться в филиалы банка до 23 декабря 2006 г.

Адреса филиалов банка и телефоны для справок:

г. Брест, ул. Советская, 50, тел.(8-0162) 23-08-36
г. Витебск, ул. Ленина, 22/16, тел.(8-0212) 29-75-01
г. Гомель, ул. Советская, 7, тел. (8-0232) 74-11-45
г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, тел. (8-0152) 72-02-13
г. Минск, пр. Машерова, 29, тел. (8-017) 289-35-28
г. Минск, ул. Коллекторная, 11, тел. (8-017) 217-30-00
г. Минск, ул. Мельникайте, 2, тел. (8-017) 203-93-96
г. Могилев, ул. Первомайская, 29-а, тел. (8-0222) 22-03-35

Заполненные бюллетени для голосования направляются Центральному банку по адресу 220002 г. Минск, пр. Машерова, 29, либо региональным филиалам банка по вышеуказанным адресам.

Справки по телефонам в г. Минске: (8-017) 289-28-26, 234-45-98.

Правление ОАО «Белинвестбанк»

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 3 от 27.10.2006 на осуществление банковской деятельности

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

КАЧЫНЬСКІ ЗАКЛІКАЎ ПАЗБАВІЦЬ ГЕНЕРАЛЬСКАГА ЗВАННЯ ЯРУЗЕЛЬСКАГА

Прэм'ер-міністр Польшчы Яраслаў Качыньскі заклікаў пазбавіць генеральскага звання 86-гадовага былога прэзідэнта і міністра абароны рэспублікі Войцеха Ярузельскага.

Такую заяву прэм'ер зрабіў з нагоды 25-й гадавіны ўвядзення ваеннага становішча ў Польшчы, якая адзначалася ўчора. Астатніх арганізатараў увядзення ваеннага становішча Яраслаў Качыньскі прапануе аддаваць пад спецыяльны суд. Між тым, паводле інфармацыі тэлеканала ТВП 3, міністр нацыянальнай абароны Польшчы Радаслаў Сікорскі не пагадзіўся з меркаваннем Качыньскага наконт пазбаўлення звання Ярузельскага. «У гэтым ужо няма неабходнасці»,— лічыць Сікорскі. На яго думку, армія не павінна займацца справай Войцеха Ярузельскага, бо яго ўжо асудзіла польская грамадскасць. Пазней міністэрства нацыянальнай абароны Польшчы паспрабавала змякчыць выказванні свайго кіраўніка. Паводле іх версіі, Сікорскі адказаў, што генерал Ярузельскі «ўжо стары чалавек. Ганьба сярод большай часткі грамадства ўжо і так вялікае і балючае пакаранне». Аналітыкі ў Варшаве мяркуюць, што ўдакладненне ваеннага ведамства зроблена ў тым ліку і для таго, каб згладзіць супярэчнасці паміж міністрам абароны і прэм'ерам, якія апошнім часам абвастрыліся.

У цяперашні час генерал Войцех Ярузельскі знаходзіцца ў варшаўскім ваенным шпіталі з дыягназам запаленне лёгкіх. У 1968 годзе Ярузельскі стаў міністрам абароны Польшчы і браў актыўны ўдзел ва ўварванні войскаў СССР і яшчэ трох дзяржаў Варшаўскага пакта ў Чэхаславакію. У 1981 годзе ён стаў лідарам польскіх камуністаў і прэм'ер-міністрам і хутка пасля гэтага ўвёў ваеннае становішча.

«ЭСТОНІЯ» ПЕРАВОЗІЛА ЗБРОЮ?

Эстонія ўдзельнічала ў перавозцы баявой тэхнікі ў Швецыю на пароме «Эстонія», які затануў, сцвярджае член эстонскага парламента, былы міністр замежных спраў Трывімі Велістэ.

На пасяджэнні камісіі па расследаванню абставінаў гібелі парома Велістэ заявіў, што ведаў людзей, якія арганізавалі гэтыя перавозкі. На тым жа пасяджэнні намеснік старшыні канстытуцыйнай камісіі эстонскага парламента Эвелін Сеп заявіла, што адказнасць за незаконную перавозку ляжыць на тагачасным прэм'ер-міністры, а зараз дэпутаце парламента Марце Лаарэ. «Ён маніць і маніць і са спакойным сэрцам прымае ад шведскай дзяржавы так званую плату за маўчанне, якая яму афармляецца праз савет Банка Швецыі ці ў выглядзе прэміі «свабоднай рынкавай эканомікі» ў мільённых памерах», — заявіла Сеп. Яна не выключыла, што пра гісторыю з перавозкай зброі ведалі многія члены цяперашняга і папярэдніх урадаў. На думку Сеп, гэта скандал: «Тагачасныя міністры, якія патуралі перавозцы ваеннай тэхнікі і ставілі пад пагрозу тысячы жыццяў, здзейснілі злачынства супраць чалавечнасці».

Паром «Эстонія» затануў на шляху з Таліна ў Стакгольм у ноч на 28 верасня 1994 года. Загінулі 852 пасажыры і члены экіпажа. У апошні час у Швецыі і Эстоніі ўсё часцей звязваюць прычыны гібелі парома з перавозкай Швецыяй расійскай зброі, якую спецслужбы здабылі падчас вываду расійскіх войскаў з Эстоніі.

АМЕРЫКАНСКІЯ ГЕНЕРАЛЫ ПАТРАБУЮЦЬ ВЫВЕСЦІ АРМІЮ З-ПАД АГНЮ

Высокапастаўленыя члены аб'яднанага камітэта начальнікаў штабоў арміі ЗША рэкамендавалі прэзідэнту Бушу змяніць стратэгію выкарыстання ўзброеных сіл у Іраку. Военачальнікі настойваюць на тым, што асноўнай місіяй амерыканскай групоўкі павінна стаць не барацьба з баевікамі, а падтрымка іракскай арміі і пошук тэрарыстаў.

Камандуючы амерыканскімі сіламі ў Іраку генерал Джордж Кейсі мае намер прадаставіць план па вываду ўсіх войскаў з іракскіх гарадоў і кансалідацыі іх на некалькіх апорных базах. Ваенныя не бачаць неабходнасці ў павелічэнні колькасці кантынгенту амерыканцаў у Іраку.

«Гарачы» тэлефон «Звязды» 287-17-41

Гарантыя на колы

Наш даўні і пастаянны чытач са Шчучына спадар Сідар, чарговы раз сутыкнуўшыся з жыццёвай праблемай, папрасіў дапамогі і парады «Звязды».

— У магазіне на аўтазаправачнай станцыі ў Мастах набыў для свайго транспартнага сродку зімовую гуму айчыннай вытворчасці на пярэднія колы. Аднак прадавец пры гэтым адмовіўся назваць гарантыйны тэрмін на шыны, маўляў, яго няма. Ці можа быць так? Паводле слоў усё таго ж прадаўца, у выпадку выяўлення заводскага браку я павінен буду звяртацца не ў гэтую гандлёвую кропку, а непасрэдна да вытворцы. Ці так гэта? — пытаўся ў нас заяўнік.

Паводле слоў начальніка ўпраўлення рэалізацыі прадукцыі «Белшыны» Андрэя Рубанава, якога мы папрасілі пракаментаваць згаданую чытачом сітуацыю, апошні крыху не разабраўся ў некаторых нюансах. Так, на кожнай шыне прастаўлены нумар тыдня і год, калі яна была выраблена. З гэтай даты на выраб даецца гарантыя тэрмінам на 5 гадоў. Гэта азначае, што на працягу памянёнага часу вытворца гарантуе — пры належнай эксплуатацыі шына павінна праслужыць менавіта столькі. Аднак кіламетраж транспартнага сродку пры гэтым не ўлічваецца, па-першае, бо можна «дабіць» шыны і пры адносна невялікім прабегу. Па-другое, далёка не кожны вадзіцель прытрымліваецца пры эксплуатацыі гэтых самых належных умоў (ціск у шынах, сход-развал, з'яўленне бруду ў дысках і г.д.).

Калі ў пакупніка ёсць прэтэнзіі да якасці прадукцыі, праводзіцца адпаведная праверка, экспертыза. У выпадку выяўлення заводскага браку тавар мяняецца бясплатна. Такім правам надзелены ўсе гандлёвыя прадпрыемствы, якія аднесены да фірменнага гандлю, і пакупнік можа смела звяртацца менавіта туды. Калі ж шыны былі набыты ў прыватніка, адказнасці за такую пакупку прадпрыемства несці не можа.

Сяргей РАСОЛЬКА.

РОДЫ ДОМА: МОДА... НА ХВОРАЕ ДЗІЦЯ?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У апошнія гады ў сталіцы павялічылася колькасць жанчын, якія нарадзілі дзіця не ў медыцынскай установе, а дома. Гэта ўжо стала данінай моды, якая прыйшла з замежных краін, разам з іншымі павевамі, такімі, як роды ў басейне, роды пры дапамозе «нетрадыцыйных» медыкаў. Між тым, «афіцыйныя» ўрачы канстатуюць факт — нараджэнне дзіцяці без дапамогі прафесійных медыцынскіх работнікаў ва ўласнай кватэры шкодзіць здароўю як маці, так і нованароджанага.

Галоўны акушэр-гінеколаг Камітэта па ахове здароўя сталічнага гарвыканкама Святлана Кандрашова лічыць, што праблема за тры гады стала вельмі балючай.

— Родавыя траўмы, септычныя ўскладненні, якія ўзнікаюць пасля родаў на даму, жанчынам усё роўна даводзіцца лячыць у медыцынскіх установах. Большасць з такіх родаў праходзіць дрэнна. Але сем'яў, якія лічаць, што нараджаць трэба чамусьці толькі ў хатніх умовах, стала вельмі шмат, — патлумачыла яна. — І асабліва насцярожвае тое, што вырашаюць нараджаць на даму не ў асацыяльных сем'ях, а наадварот, адукаваныя і паспяховыя жанчыны.

Такая маці дзевяць месяцаў павінна жаночую кансультацыю, дзе знаходзіцца пад наглядам, а калі надыходзіць час, проста знікае з вачэй медыкаў. Аб з'яўленні на свет новага жыхара сталіцы акушэры раддома даведваюцца з дзіцячых паліклінік — калі туды звяртаюцца па дапамогу бацькі немаўляці, якога напаткала наступства «моды». Здараецца, што за «прасунутыя» погляды трэба будзе разлічвацца ўсё жыццё.

— Пасля такіх родаў у бальніцу на таксі была дастаўлена жанчына ў стане клінічнай смерці. Яе ўдалося выратаваць, але маладая маці засталася глыбокім інвалідам, — прывяла толькі адзін прыклад з практыкі Святлана Кандрашова.

Можна ўзгадваць яшчэ шмат гісторый — дакладнай статыстыкі не існуе, таму што сем'і хаваюць факты, але як мінімум дзве жанчыны ў сталіцы раз у месяц нараджаюць дзіця не ў радзільным доме.

Увядзенне ж афіцыйнай практыкі родаў на даму, як адзначыла спецыяліст, патрабуе прыняцця адпаведнай заканадаўчай базы, падрыхтоўкі прафесіяналаў, набыцця дадатковага абсталявання, адным словам, значных фінансавых сродкаў. І самае галоўнае — станоўчага адказу на пытанне, ці патрэбна такая практыка, ніхто пакуль не даў.

Роды ў хатніх умовах — гэта яшчэ адзін бок праблемы дэмаграфічнай бяспекі, якая зараз адна з самых балючых. Выйсце з дэмаграфічнага крызісу шукаюць усе. У 1997 годзе нараджальнасць у Мінску ўзрасла на 15 працэнтаў, але захавалася і натуральнае змяншэнне насельніцтва. Выратоўвае пакуль тое, што зараз нараджаюць жанчыны, якія з'явіліся на свет у 80-х гадах мінулага стагоддзя, у час дэмаграфічнага буму. Гэтае пакаленне маладых людзей пачынае выконваць сваю галоўную місію — стварае сям'ю і нараджае дзяцей. «У той жа час, як падлічылі медыкі, у 2010—2015 гадах колькасць жанчын, якія могуць нарадзіць, скароціцца, расказала Святлана Кандрашова.

— І мы не можам пакуль прагназаваць тэрміны, калі нараджальнасць перавысіць смяротнасць, калі прырост насельніцтва апярэдзіць яго змяншэнне».

Выклікае заклапочанасць і стан здароўя жанчын. Ужо дзесяць гадоў узровень захворванняў сярод цяжарных вельмі высокі, шмат жанчын маладога ўзросту ўвогуле не могуць мець дзяцей. Як адзначыла Святлана Кандрашова, з усёй колькасці сталічных жанчын у рэпрадуктыўным узросце (той час, калі можна нарадзіць дзіця) знаходзіцца 57 працэнтаў. Сярод апошніх толькі 4,6 працэнта — дзяўчаты-падлеткі (а яны між тым — асноўны патэнцыял для будучыні) ва ўзросце ад 15 да 19 гадоў.

Дзмітрый АЛЬФЕР.

Добры дзень, родныя словы!

Каб не кпілі з нас...

Студэнтка Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Вікторыя Сікірыцкая ў сваім лісце піша пра дзеясловы са значэннем высмейвання, жартаў, кпінаў, якія ў нашай мове кіруюць родным склонам з прыназоўнікам з.

Насміхацца, смяяцца з (каго-небудзь, чаго-небудзь), здзекавацца з..., жартаваць з..., дзівіцца з..., глуміцца з..., кпіць з....Параўнайма з рускімі: издеваться, смеяться, шутить **над кем**.

І добра, калі б у школе гэтыя дзеясловы, заўважае студэнтка, вучыць адразу з прыназоўнікам.

Слушная думка! Сапраўды, цэлая грамадка аднатыпных дзеясловаў — шырока ўжывальных і рэдкіх, як слова **кпіць**!

Дарэчы, гэтае апошняе, не такое ўжо частае слова **кпіць** паходзіць ад слова **кеп** (дурань, ёлуп, ёлупень, доўбня), цяпер амаль неўжывальнага. Але нашы прыказкі і прымаўкі памятаюць яго. Напрыклад: «І кеп і слеп» — пра зусім нячэснага чалавека, бо той і дурны і сляпы. Або: «Кеп, дурань і блазан — тры дабры разам».

У «Слоўніку беларускай гаворкі» І.І. Насовіча» (1870 год выдання) адзначана і памяншальнае ўтварэнне — **кепік** (пра малечу, яшчэ недарослую блазноту). А ўвогуле яго адмысловы корань пусціў такія атожылкі, што сёння не заўсёды пазнаеш яго сваякоў.

Вядома ж, вельмі выразна блізкія да дзеяслова кпіць словы **кплівы, кплівасць, кпіны, кпінкі** (кпіны, кпінкі, кепікі строіць — што амаль тое самае, што строіць жарты, смешкі, насміхацца з каго-небудзь).

Насовічаў слоўнік падае кепікі і яшчэ ў адным значэнні пры гульні ў карты. Гуляць у кепікі — г. зн. гуляць у дурня. І адпаведны прыклад: «Я з табою ў кепікі не гуляў, што ты мяне завеш кепам».

А глядзіце, колькі больш далёкіх сваякоў у гэтага слова ў нашым штодзённым ужытку: кепскі, кепска, кепскае (у зн. назоўніка), кепства (зрабіць кепства) і г.д.

Ды мы адхіліліся ад галоўнага. А яно ў тым, каб дзеяслоў **кпіць**, як і яго паплечнікі ў падобным значэнні — **здзекавацца, жартаваць, насміхацца, смяяцца, дзівіцца, глуміцца** і інш., ужываліся намі з прыназоўнікам з і родным склонам назоўніка ці адпаведнага лічэбніка, займенніка.

І хай за ўзор будзе нам прыклад з народнай песні, якую спявала Адаму Міцкевічу яго каханая Марыля Верашчака:

Да цераз мой двор,
Да цераз мой двор
Цяпера ляцела.
Да не даў мне Бог,
Не судзіў мне Бог,
За каго хацела.
З кім стаяла,
Размаўляла
Ды падарачкі брала,
З каго кпіла,
Смяялася,
Сама таму дасталася.

(Гл. уступны артыкул К. Цвіркі да «Выбраных твораў» А. Міцкевіча (Мн. «Беларускі кнігазбор», 2003).

Дык правільна ўжывайма гэтыя дзеясловы, каб ніхто не пакпіў, не насмяяўся з нашага ведання роднай мовы.

Рубрыку вядзе Анатоль КЛЫШКА.

Прамая лінія

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЕ РАДЫО

Вам — ільгота. Падатковая

З 1 студзеня 2007 года ў краіне пачынаецца чарговая кампанія па дэклараванню сукупнага гадавога даходу. Як і ў мінулыя гады, падаваць дэкларацыю ў падатковую інспекцыю абавязаны грамадзяне, якія мелі некалькі крыніц даходу, тыя, хто працаваў за мяжой ці атрымаў даходы з-за мяжы. Праўда, чарговая кампанія пройдзе з адной важнай асаблівасцю: у многіх людзей з'явіцца магчымасць скарыстацца льготай і вярнуць з бюджэту пераплачаныя грошы. Перш за ўсё гэта датычыцца тых, хто плаціў за атрыманне адукацыі, купляў ці будаваў кватэру. Хто абавязаны падаваць дэкларацыю аб сукупным гадавым даходзе, якія катэгорыі грамадзян маюць права на падатковыя льготы, дзе можна атрымаць гэтыя грошы, — пра гэта і іншае на «прамой лініі» Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё ішла гутарка журналіста Максіма Угляніцы і карэспандэнта «Звязды» з начальнікам упраўлення падаткаабкладання грамадзян, дэкларавання даходаў і маёмасці Міністэрства па падатках і зборах Беларусі Марынай Грыгарчук. А пачалася гутарка з пытання, хто абавязаны падаваць падатковыя дэкларацыі?

— Канчатковая выплата падатку будзе рабіцца не пазней тэрміну 15 мая 2007 года, — гаворыць Марына Грыгарчук. — Такім чынам, час яшчэ ёсць. Хто павінен падаць падатковую дэкларацыю? Калі фізічная асоба на працягу 2006 года мела некалькі месцаў працы, або мела месца асноўнай працы і працавала па дагаворах-падрадах, або на працягу года працавала ў некалькіх месцах проста па дагаворах-падрадах, і сукупны даход такой асобы перавысіў 7 мільёнаў 360 тысяч рублёў, то такім грамадзянам трэба будзе абавязкова падаваць падатковую дэкларацыю. Тое ж датычыцца грамадзян, якія атрымалі даходы за мяжой ці з-за мяжы. І наважна, якія гэта даходы: за працу за мяжой, у выглядзе прыватных пераводаў не ад блізкіх сваякоў, падарункі ці ўсемагчымага роду выйгрышы. Зараз у Інтэрнэце праходзіць шмат розных рэкламных кампаній, гульняў, у тым ліку таталізатары. Дык вось і гэтыя выйгрышы таксама павінны ўказвацца ў дэкларацыі, і па іх неабходна абавязкова падаваць падатковую дэкларацыю. Акрамя таго, абавязкова павінны падаваць падатковую дэкларацыю тыя фізічныя асобы, якія на працягу 2006 года атрымалі даходы ад іншых фізічных асоб, нават на тэрыторыі Беларусі. Зараз у нас дастаткова распаўсюджаныя выпадкі, калі фізічныя асобы найбольш грамадзян у якасці хатніх работнікаў, напрыклад, на працу гувернанткамі. Апошнія таксама абавязаны падаваць падатковую дэкларацыю. Гэта датычыцца і асоб, якія ў Беларусі атрымалі пэўныя грашовыя сродкі ад іншых грамадзян у прыватным парадку, калі ім былі зроблены буйныя падарункі ад фізічных асоб — больш за 500 базавых велічынь, калі яны прадавалі іншым фізічным асобам нейкую маёмасць, калі фізічныя асобы атрымалі пэўную кампенсацыю па рашэннях суда, напрыклад, кампенсацыю маральнага ўрону, — такія выплаты таксама абавязкова адлюстроўваюцца ў дэкларацыі. Да таго ж у нас ёсць яшчэ адна катэгорыя плацельшчыкаў, якія таксама абавязаны дэкларавать даходы, — гэта індывідуальныя прадпрымальнікі.

Ігар ШЧУЧЭНКА.
(Працяг будзе.)

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь Сукалу Валянціну Алегавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.

Калектыў газеты «Звязда» выказвае спачуванне Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь Сукалу Валянціну Алегавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.

Глыбінка

ФЕРМЕРЫ, У ГУРТ!

Чалавек зямлі заўсёды быў вялікім індывідуалістам. Араў, сеяў... і хацеў каб не перашкаджалі працаваць. Але часта ў яго не пыталі, што ён думае і як хоча жыць. Сёння сітуацыя паступова мяняецца, учарашнія калгаснікі становяцца фермерамі і працягваюць быць індывідуалістамі.

У райвыканкаме сабраліся фермеры Баранавіцкага раёна, каб абмеркаваць свае праблемы і аб'яднацца. На сходзе прысутнічалі кіраўнікі рэспубліканскай і абласной фермерскіх асацыяцый, і гэта надало размове пэўнае ажыўленне.

У раёне зарэгістравана 47 фермерскіх гаспадарак, але толькі трое фермераў, хоць і вядучых, да гэтага ўступілі ў асацыяцыю, а ёй, як і любой арганізацыі, патрэбна колькасць.

Аб'яднанне ж неабходна, каб фермерам прасцей можна было вырашаць многія праблемы. Напрыклад, фермеру патрэбны мінеральныя ўгнаенні, але ў абмежаванай колькасці, як і хімікаты для аховы раслін. Толькі вось чыноўнікі няветліва сустракаюць фермераў.

— А што на вас заробіш? Лепш не дурыце нам галаву.

Яно і зразумела, бо фермеру не патрэбен вагон угнаенняў, а ўсяго некалькі тон, але прывезці іх чыгункай вельмі дорага. Загрузка, перавозка, разгрузка і захоўванне вылівающца ў вялікую суму. Усё было б лягчэй, калі б у фермераў была свая арганізацыя і ўсе заяўкі на тыя ж угнаенні паступалі ў адны рукі і пастаўка рабілася б для ўсіх фермераў раёна. Справа за малым — аб'яднаннем. І ў гэтым плане Брэстчына значна адстае ад фермераў Гродзеншчыны ці Гомельшчыны.

— Вось мы выпускаем газету «Наш фермер», але купіць яе фермеры асабліва не спяшаюцца, — паскардзіўся старшыня рэспубліканскай асацыяцыі К. Ярмоленка.

«Наш фермер» знаходзіцца на шляху станаўлення, пры накладзе ў 299 экз. распаўсюдзіць газету сярод некалькіх тысяч фермераў, здавалася б, можна было б лёгка, але ж чалавека зямлі разварушыць няпроста. Хоць у эканамічна развітых краінах фермеры даўным-даўно аб'яднаныя. Мабільнасць дапамагае выжыць ва ўмовах рынку, ды і своечасовая інфармацыя спрыяе гэтаму.

А зараз звернем увагу на прадукцыю, якую прапанаваў на сходзе фермерскім гаспадаркам Баранавіцкі аўтаагрэгатны завод. Моталябёдку, плуг, акучнік ды сеялку-раскідвальнік рэкламавалі прадстаўнікі завода. Цікавасць выклікала сеялка, якую скапіравалі з драўлянай, знойдзенай на адным з хутароў. Можа тая сеялка ў металічным варыянце і добрая, але адзін з фермераў адзначыў, што ў Польшчы такая ж сеялка каштуе 50 долараў і, напэўна, лепш прывезці адтуль, чым плаціць за сваю 150 «зялёных». Рынак ёсць рынак, і не ўлічваць кошт прадукцыі канкурэнтаў — пазіцыя блізарукая.

А цяпер аб праблемах, якія ўзнялі фермеры.

Тое, што яны не канкуруюць адзін з другім, гэта добра. У сельгаскааператывах свая ніша, і ў гэтым плане ў нашых фермераў менш праблем са збытам прадукцыі. Фермеры Брэстчыны галоўным чынам вырошчваюць агародніну, а вось жывёлагадоўляй займаюцца менш. А калі мала жывёлы, то не хапае арганікі. Сёлета фермеры Баранавіцкага раёна сабралі з гектара ў сярэднім па 13 цэнтнераў збожжа, а бульбы — у межах 200 ц/га. Мала, але справа тут не толькі ў тым, што ў фермераў не самая лепшая зямля. Адчуваецца недахоп угнаенняў і хімікатаў. Пакуль што фермерам раёна цяжка канкурыраваць з братамі Аўдзеямі з-пад Клецка, якія збіраюць рэкордныя, нават па еўрапейскіх мерках, ураджаі гародніны.

У кожным раёне вобласці ёсць па некалькі фермерскіх гаспадарак, якія могуць быць прыкладам для іншых, але ж яны ў цэлым, пагоды не робяць. Баранавіцкі раён у плане фермерскіх гаспадарак — адзін з самых моцных у вобласці, хоць і тут толькі 4 фермеры маюць па 100 і больш гектараў зямлі.

Фермеры скардзіліся, што вельмі цяжка набыць спісаную тэхніку ў сельгаскааператывах ці іншых дзяржаўных арганізацыях.

— Я лепш трактар парэжу на металалом, чым прадам, — кажа іншым разам старшыня СВК, — клопату не буду ведаць. Мяне ніхто не будзе правяраць і падазраваць, што прадаў за хабар.

Праўда, магчымасць прадаць ёсць, але па цане не ніжэй чым 30 працэнтаў ад кошту новай тэхнікі. Вось тады ад кантралёраў прэтэнзій не будзе. Але плаціць такія грошы за дабіты трактар ці камбайн ужо не хочуць фермеры. І ўсё ж гэта не такая ўжо і вялікая праблема, каб нельга было яе закрыць. Чаму б у раёне не арганізаваць аўкцыён старой тэхнікі, ды і рашэнне праўлення СВК, напэўна, мае сілу. Хоць, як прапануюваецца, фермеру падана прыйсці на сход сельгаскааператыва, і калі людзі прагаласуюць, то тэхніку прададуць.

Немагчыма ў раёне атрымаць фермеру і тэхніку па лізінгу. Напрыклад, адзін з лепшых фермераў раёна С. Матус чакае трактар ужо 13 гадоў.

З насеннем таксама не ўсё гладка, бо тут існуе свая схема размеркавання, і фермеры не заўсёды ўключаюцца ў спісы. Хоць прадстаўнікі райвыканкама выказалі свае прэтэнзіі да фермераў. Маўляў, цягнуць з падачай заявак да апошняга, хоць павінны былі б пакласці на стол іх даўно.

Фермеры ў нас усё яшчэ пасынкі.

— У нас галава найперш баліць за сельгаскааператывы, а не за фермераў, — адкрыта заявіў адзін са спецыялістаў райвыканкама.

Яно і зразумела: за 11 месяцаў ад фермераў паступіла 42 млн рублёў падаткаў, а гэта 0,1 працэнта ад агульных паступленняў па раёну.

Наконт адносінаў з банкам фермеры дружна заявілі, што тут усё нармальна. «Белаграпрамбанк» можа даць крэдыт, нават пад заклад будучага ўраджаю, а гэта крок наперад.

Хацелася б, каб ад свайго аб'яднання фермеры атрымалі рэальную дапамогу.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Крымінал, здарэнні

БЕЗАКЦЫЗНЫ ТАВАР

У Кобрыне ў гаражы мясцовага жыхара захоўвалася алкагольная і тытунёвая прадукцыя, якая не мела акцызных марак Беларусі.

У прыватнасці, тут было знойдзена і канфіскавана 3 тысячы пачкаў цыгарэт і 433 бутэлькі гарэлкі на агульную суму 17,9 мільёна рублёў.

Уся прадукцыя — украінскай вытворчасці. У гэты ж дзень паблізу Бярозы супрацоўнікі ГУУС Мінгарвыканкама затрымалі аўтамабіль «Опель», якім кіраваў мінчанін. У салоне машыны таксама знойдзена кантрабанда: праваахоўнікі канфіскавалі 356 бутэлек гарэлкі на суму 10 мільёнаў рублёў.

Ігар ГРЫШЫН.

ЦЫГАНКІ ПАДМАНУЛІ ПЕНСІЯНЕРКУ

У хату пенсіянеркі ў вёсцы Ласіца Пастаўскага раёна зайшлі тры цыганкі. Быццам бы прапаноўвалі купіць рэчы.

Пасля таго як нечаканыя госці пайшлі, бабулька не змагла знайсці ўласныя 1,7 мільёна рублёў, 320 долараў ЗША і мабільны тэлефон «Нокіа». Агульная страта — 2,4 мільёна беларускіх рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПАКРЫЎДЗІЛІ ЖЫХАРКУ ЛАТВІІ

У Браслаўскі РАУС звярнулася па дапамогу жыхарка латвійскага Даўгаўпілса, якая заявіла, што яе дачны дом на Браслаўшчыне наведалі невядомыя злачынцы. Увайшлі праз акно.

Скралі самыя розныя рэчы, у тым ліку электрычныя інструменты, а таксама спіртное на агульную суму 1 мільён рублёў. Супрацоўнікі крымінальнага вышуку ўстанавілі, што злачынства ўчыніў беспрацоўны жыхар Мінскай вобласці 1980 года нараджэння. Узбуджана крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Погляд

Шляхам паразумення — каб графаманія не стала прыкметай часу

Палемічныя нататкі напярэдадні з'езда Саюза пісьменнікаў Беларусі

Кажуць, што ў Беларусі паэтаў, як бяроз... Мяняюцца эпохі, улады, а вершатворцаў менш не стае. Наадварот, большае. Лезуць, як трава з-пад асфальту.

Тое, што мы маем тут справу з духоўнай з'явай, — бясспрэчна. Своеасаблівае, так бы мовіць, праяўленне інстынкту самазахавання нацыі. З выразна акрэсленым палітычным падтэкстам. Дастаткова нагадаць, што вызваленчы рух на ўскраінах Расійскай імперыі ў XIX стагоддзі пачынаўся з адмысловай паэзіі. Славянскія Беларусь, Украіна... Эстонцы, якія належаць да угра-фінскай групы народаў... Усе пачыналі аднолькава — з рыфмаваных ідэй свабоды, роўнасці, братэрства. Проза і драматургія расквітнелі пазней. Прыярытэт паэзіі ў сферы класічнай літаратуры гістарычна спраўджаны. Хто зможа аспрэчыць першынство Дантэ, Шэкспіра і Пушкіна ў вызначэнні маральна-эстэтычных каштоўнасцяў не толькі сваіх народаў, але і ўсёй духоўнай моцы Чалавека пасля нараджэння Хрыста?

Аднак вернемся да ўласнай гісторыі. Айчынныя паэты-першапраходцы Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Францішак Багушэвіч пачыналі з сацыяльнага пратэсту («Бог няроўна дзеліць!»). А ў XX стагоддзі на беларускім небасхіле ўзышлі новыя непагасныя зоркі — Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч. У іх творчасці, акрамя апісання прыроды і сялянскага побыту, ужо безліч іншых матываў. Перадусім — вострае адчуванне неабходнасці стварэння ўласнай дзяржавы.

Што бачым сёння? Рэдакцыйныя партфелі штодыднёвіка «Літаратура і мастацтва», часопісаў «Полымя» і «Маладосць», «Нёман» і «Всемирная литература» (рускамоўныя) пухнуць ад паэтычных допісаў. Наколькі я ведаю, не скардзяцца на іх недахоп і апазіцыйныя выданні — часопіс «Дзеяслоў», газеты «Народная воля», «Наша ніва», «Наша слова» і іншыя.

Дзякуючы прафесійнаму адбору прыстойныя выданні абы-што не друкуюць. Непакоіць іншае. Нашэсце «самапальных» творцаў. Яны выдаюць сваю пісаніну не толькі за ўласныя грошы, але вельмі часта знаходзяць спонсараў сярод паасобных кіраўнікоў дзяржаўных устаноў і прадпрыемстваў. «У правінцыі, — піша С. Грышкевіч («ЛіМ», 8 снежня г.г.), — графаманаў больш, чым камароў на ўрадлівых палескіх балотах... Вось, скажам, берасцейскі паэт-«самародак» з членскім білетам С. за два апошнія гады выдаў дзве шыкоўна аформленыя кнігі альбомнага фармату агульным накладам звыш 10 тысяч (!) асобнікаў. Удалы камерцыйны праект С. аформіў у выглядзе лірычна-вытворчых паэм пра двух мясцовых старшынь сельскагаспадарчай нівы. Выдаў — ну і добра. Але навошта аўтару трубіць па ўсёй вобласці аб годным мастацкім узроўні таго, што назваць літаратурай нельга пры ўсім жаданні, і «запіхваць» праз абласную «вертыкаль» сваю «каштоўную» прадукцыю ў бібліятэкі?»...

Рэгіёны... А што ў сталіцы? Радкі з кнігі вершаў, выдадзенай «Беллітфондам» у 2006 годзе: «Зноў прыйшла ды ў госці восень, У дзевак, як у маі, не папросіш, падмаўляй — не падмаўляй, Бывай любоў, чароўны май». Ці: «Известен всем Амур с крылами, Но более известны его стрелы, Разит он меткими стрелами, Попадая в девичьи пределы».

Серада з-пад пятніцы. Галоўліта няма. Разлічваць на самацэнзуру таксама не даводзіцца, бо графаманія — хваравітае захапленне, якому падуладныя і дзеці, і дактары навук. Выйсце? Думаю, што варта стварыць пры двух (менавіта двух — для пошукаў згоды і паразумення!) дзеючых Саюзах пісьменнікаў Камісію па этыцы, якая б стрымлівала прыём у Саюзы апантаных «літаратурай» людзей. Экспертныя заключэнні камісіі сталі б сітам і пры рассылцы падобных «шэдэўраў» у бібліятэкі рэспублікі.

Другой важнай справай, на мой погляд, маглі б стаць інтэлектуальна-мастацкія намаганні пісьменнікаў, зноў-такі незалежна ад іх членства ў той ці іншай суполцы, пры фарміраванні (працэс гэты — бясконцы) пазітыўнага іміджу Беларусі ў свеце. На гістарычныя тэмы ў нас пішуць (па алфавіце): У. Арлоў, Л. Дайнека, В. Іпатава, В. Коўтун, А. Навагрыч, А. Петрашкевіч, Э. Скобелеў, К. Тарасаў і шмат хто яшчэ. А дзе заўжды актуальныя матэрыялы аб гістарычнай спадчыне розных культур і народаў у Беларусі? Публікацыі, якія б з задавальненнем пераклалі (зноў па алфавіце) у Балгарыі, Германіі, Ізраілі, Латвіі, Літве, Польшчы, Расіі, Сербіі, Украіне, Францыі, Швецыі... Да прыкладу. Палякі абавязкова паказалі б на адным з нацыянальных тэлеканалаў невялікі фільм аб гістарычных камянях на тэрыторыі Беларусі, цесна звязаных з імёнамі Адама Міцкевіча і Юзэфа Пілсудскага. Немцы зрабілі б тое самае, калі б ім прапанавалі стужку пра захаванне ў Беларусі надмагільных помнікаў часоў Першай сусветнай вайны. Сэнс сучаснай глабалізацыі не толькі ў распаўсюджанасці Інтэрнэта і мабільнай сувязі.

Трэцяе, пра што хочацца сказаць, гэта ўдзел літаратараў у стварэнні грамадскай думкі ўнутры краіны, больш пашырана, грамадскай супольнасці. Чаму мы бачым на нацыянальным тэлебачанні асоб, якія, прэтэндуючы на ідэалагічнае настаўніцтва, не валодаюць па-сапраўднаму ні рускай, ні беларускай мовамі? Канкрэтная прапанова: выспела неабходнасць арганізацыі ці рэанімацыі медыя-электроннай крытыкі. Хто як не пісьменнікі (многія з іх маюць багаты вопыт працы на тэлебачанні і радыё) павінны ўзначаліць гэты накірунак?

Зазірнём у каляндар. У наступным годзе — некалькі важных юбілеяў. 125-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа. Спаўняецца 75 гадоў з дня заснавання газеты «Літаратура і мастацтва». Названых дат дастаткова, каб любому майстру слова задумацца аб сваім месцы ў грамадскім жыцці і пакончыць з зацятымі ўнутрыцэхавымі спрэчкамі раз і назаўсёды.

Сёння, можа, як ніколі, з боку творчай інтэлігенцыі патрабуецца нацыянальная згода, пошук вырашэння паасобных праблем. У імя чаго і каго? Адказ кароткі — Беларусі.

Вячаслаў ДАШКЕВІЧ.

Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ:

Жыллё

«ПРАПАНОЎ ЗМЕНШЫЛАСЯ ЎДВАЯ»

Кватэры ў Мінску за апошнія два месяцы падаражэлі прыкладна на 4—5 тыс. USD

Яшчэ летам шматлікія спецыялісты айчыннага рынку нерухомасці прагназавалі канчатковую стабілізацыю цэн на сталічнае жыллё. Летам цэны на кватэры і сапраўды «стаялі», але потым... Сёння на пытанні карэспандэнта газеты «Звязда» адказвае дырэктар Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай Прасталупаў.

— Днямі адзін калега паскардзіўся, што ўжо цэлы месяц не можа адшукаць сабе кватэру ў мікрараёне, дзе працуе яго жонка і вучыцца ў школе дачка. Няўжо зараз прадаўцоў стала менш, а набыццё кватэры стала праблемай?

— Толькі ўчора мае работнікі дасканала прааналізавалі базу патэнцыяльных прадаўцоў і пакупнікоў жылля. Сёння ў параўнанні са жніўнем колькасць прапаноў кватэр на продаж на мінскім рынку другаснага жылля скарацілася ўдвая.

— Чаму людзі адмаўляюцца выстаўляць сваё жыллё на продаж? Яны чакаюць нейкіх змен на рынку?

— Не. Чакаць няма чаго. Справа ў тым, што каля 90 працэнтаў тых, хто прадае сваё жыллё, адначасова купляе ўзамен іншае — большае ці меншае па плошчы. Раней, калі ты маеш аднапакаёвую кватэру і вырашыў купіць «двушку», трэба было адшукаць каля 10—12 тысяч долараў, тады і будзе рэальна правесці падобную ракіроўку. Зараз цэны яшчэ падраслі і трэба ўжо дабавіць 15—18 тысяч долараў, каб пераехаць у большую кватэру. Большасць патэнцыяльных «ракіроўшчыкаў» назбіраць такія сродкі ўжо не могуць.

Кліенты, якія збіраліся такім чынам вырашыць жыллёвыя праблемы, чакалі менавіта свайго спрыяльнага моманту, каб даражэй прадаць уласную нерухомасць і купіць ужо танней. Але такіх «хітруноў» на рынку нерухомасці было вельмі шмат. Яны не куплялі і не прадавалі кватэры, але кожныя два тыдні перапісвалі цэннікі на сваё жыллё. Такое «віртуальнае» падаражанне працягвалася гадамі. Зараз такія клиенты ўжо стаміліся чакаць свайго часу і пакінулі рынак нерухомасці. Сёння колькасць патэнцыяльных прадаўцоў стала ў два разы меншая, чым летам.

Яшчэ некалькі месяцаў таму мы назіралі не вельмі добрую тэндэнцыю па зніжэнню колькасці прапаноў на другасным рынку нерухомасці. Зараз гэта тэндэнцыя працягваецца і нават набірае «абароты», калі ланцуговая рэакцыя чапляе ўсё новых прадаўцоў, якія таксама пакідаюць рынак. У сувязі з гэтым запас паменшылася і колькасць прапаноў і па чыстым продажу, калі жыллё толькі прадаецца.

— Згодна са статыстыкай рэспубліканскага выдання «Нерухомасць Беларусі», сёння істотнае зніжэнне колькасці прапаноў паўплывала і на кошт жылля. Спецыялісты падлічылі, што кошт квадратнага метра жылля агульнай плошчы аднапакаёвых кватэр павялічваецца прыкладна на 10—13 долараў за тыдзень. Як моцна падаражэла жыллё на другасным рынку нерухомасці галоўнага мегаполіса краіны за апошнія два месяцы?

— Калі колькасць прапаноў на рынку істотна памяншаецца, то гэта заўсёды выклікае рэзкае падаражанне тавараў. Гэта не эканамічна абгрунтаванае падаражанне, а выкліканае на эмоцыях. Самыя танныя аднапакаёвыя кватэры зараз магчыма набыць ужо толькі за 40 тысяч долараў. Праўда, у каталогах усіх агенцтваў нерухомасці сталіцы існуе каля 15—20 варыянтаў зусім слабых і маленькіх «хрушчовак» на крайніх паверхах старых панэльных дамоў, якія зараз прапануюцца за 38—39 тысяч долараў. Аднак за такія грошы купляць нейкі стары заканурак я не раіў бы. За апошнія два месяцы вельмі моцна падаражэлі менавіта маленькія аднапакаёвыя кватэры, якія зараз сталі каштаваць прыкладна на 4—5 тысяч долараў больш. Такія тыпы кватэр заўсёды карыстаюцца павышаным попытам. Сярэдні кошт аднаго квадратнага метра агульнай плошчы аднапакаёвых кватэр зараз дасягнуў 1301 долара. Сярэдні кошт аднапакаёўкі па табліцах прапаноў стаў 44 908 долараў.

— Як моцна падаражэлі за гэты час двухпакаёвыя кватэры?

— Падаражанне на такое жыллё было крыху меншым. За апошнія два месяцы восені «двушкі» сталі каштаваць прыкладна на 3,5—4,5 тыс. долараў больш. Сярэдні кошт квадратнага метра такіх кватэр зараз дасягнуў 1203 долары. Звычайная тыпавая двухпакаёвая кватэра каштуе зараз ужо каля 60 тысяч долараў.

— Гэтай восенню даражэлі толькі маленькія кватэры. Няўжо жыллё з вялікай плошчай застаецца «ў цені»?

— Зараз мы назіраем прынцыпова новую тэндэнцыю. Калі месяц таму 3- і 4-пакаёвыя кватэры не даражэлі, а нават часам таннелі, то з другой паловы лістапада кошт трохпакаёвак стаў істотна павялічвацца. Сёння сярэдні кошт квадратнага метра жылля агульнай плошчы трохпакаёвых кватэр дасягнуў 1147 долараў. «Тройкі» падаражэлі прыкладна на 3 тысячы долараў.

— Магчыма, людзі пачалі ўкладваць свае свабодныя грошы ў нерухомасць?

— Не. Трохпакаёвая кватэра каштуе зараз 70—80 тысяч долараў. Адкуль у простых грамадзян Беларусі такія свабодныя грошы? Тым больш, што на другасным рынку нерухомасці гутарка ідзе аб звычайных кватэрах у панэльных дамах. Вядома, што мэтазгодна ўкладваць вялікія грошы ў элітную нерухомасць, на якую можа адшукацца свой багаты пакупнік.

— Што нам чакаць на другасным рынку нерухомасці да пачатку новага года?

— Звычайна, ужо традыцыйна невялікае сезоннае падаражанне жыллёвай нерухомасці адбываецца штогод менавіта да 25 снежня. Потым, на Каляды, большасць агенцтваў нерухомасці спыняюць сваю дзейнасць. Сёлета такое сезоннае падараж

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

15 СНЕЖНЯ 2006 г. ПЯТНІЦА № 49 (15449)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Наш фармат

«Прамоўца года» вучыцца ў Маладзечне

Пераможцай конкурсу прамоўніцкага майстэрства «Залатавуст-2006» стала навучэнка Маладзечанскага гандлёва-эканамічнага каледжа Белкаапсаюза Аляксандра Бароўская.

За галоўны тытул у фінале змагаліся 10 чалавек — навучэнцы сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, у якіх вядзецца падрыхтоўка будучых спецыялістаў у галіне юрыспрудэнцыі. Фінальны этап складаўся з трох тураў: «Эпіграф», «Выказванне» і «Дыспут». «Ці мае права жанчына з ВІЧ нарадзіць дзіця?», «Пакараць нельга памілаваць: ці патрэбна смяротнае пакаранне?», «Маральнае аблічча юрыста», «Не пакідайце ж мовы беларускай, каб не ўмёрлі», «Усё ў руках чалавека, а чалавек — у руках жанчыны», «Больш моцным за смерць бывае каханне» — вось далёка не поўны пералік тэм, на якія выказваліся ўдзельнікі конкурсу прамоўніцкага майстэрства. У выступленнях канкурсантаў журы ацэньвала не толькі змест, кампазіцыю і моўныя сродкі, але таксама і кантакт з аўдыторыяй.

Другое месца, а таксама прыз глядацкіх сімпатый і званне «Народны прамоўца» заваяваў навучэнец 3-га курса Юрыдычнага каледжа БДУ Станіслаў Дземідовіч. На трэцім месцы — навучэнец Аршанскага дзяржаўнага аграрна-эканамічнага каледжа Андрэй Матылевіч.

Надзея НІКАЛАЕВА.

У маладым целе — здаровы дух

15 снежня ў Гомелі стартуе першы этап рэспубліканскай акцыі «Моладзь — за здаровы лад жыцця!», ініцыятарамі якой выступілі МУС і Міністэрства адукацыі.

Як паведамілі «Звяздзе» ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Міністэрства ўнутраных спраў, студэнты Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта падрыхтавалі для гомельскіх падлеткаў відэафільм аб шкодзе алкаголю, наркатычных і псіхатропных рэчываў, байцы спецназа ўнутраных войскаў прадэманструюць сваё майстэрства. Таксама запланаваны канцэрт мастацкіх калектываў і аркестра МУС, зорак айчыннай эстрады: гурта «Тяни-Толкай», танцавальнай групы экстрэмальнай акрабатыкі і брэйк-данса «Street Masters».

Акцыя адбудзецца ў канцэртнай зале грамадска-культурнага цэнтра, што на вуліцы Ланге, 17. Пачатак а 14-й гадзіне.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

«Астравок» турэцкай культуры ў БДУ

Цэнтр турэцкай мовы і культуры адкрыўся днямі ў філалагічным факультэце ў Беларускім дзяржаўным універсітэце.

Грамадзяне Турцыі праяўляюць апошнім часам вялікі інтарэс да БДУ. Упершыню студэнтамі Белдзяржуніверсітэта сталі сёлета шэсць грамадзян Турцыі: двое з іх праходзяць навучанне ў магістратуры факультэта міжнародных адносінаў, а чацвёра — студэнты першага курса філалагічнага факультэта, дзе займаюцца вывучэннем рускай філалогіі. Акрамя таго на факультэце даўніверсітэцкай адукацыі навучаюцца яшчэ 22 грамадзяніна Турцыі.

Плануецца, што ў Цэнтры турэцкай мовы і культуры будуць ладзіцца заняткі па вывучэнню турэцкай мовы — для беларускіх студэнтаў і рускай мовы — для студэнтаў з Турцыі. Цэнтр аснашчаны сучаснымі камп'ютарамі, мультымедыйнымі і тэхнічнымі сродкамі. У ім сабраныя таксама метадычная, краязнаўчая і мастацкая літаратура на турэцкай мове.

У апошнія гады філалагічны факультэт плённа супрацоўнічае з пасольствамі розных краін, і, дзякуючы падтрымцы замежных прадстаўніцтваў, у БДУ ўжо працуюць кабінеты кітайскай, польскай, украінскай і італьянскай філалогій.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Пакаленні

«РЭАЛІЗУЮ СЯБЕ ЦАЛКАМ...»

Мудрыя людзі кажуць, што сапраўдны талент здольны адчыніць любыя дзверы. Гэтую простую ісціну выдатна пацвярджае гісторыя Ірыны Лукашэвіч. Пра тое, як простая дзяўчынка з Баранавічаў крыху падрасла, з «чырвоным» дыпломам скончыла ўніверсітэт і стала лепшым педагогам-арганізатарам краіны! Усё вельмі проста... Таленавітая і абаяльная дзяўчына Ірына зрабіла тое, што не ўдавалася мінскім прадстаўнікам дзесятак гадоў. Перамога ў руках прадстаўніцы Мінска!

Усё пачалося ў сярэдняй школе № 21 горада Баранавічы, дзе сумленна вучылася наша гераіня. «Гледзячы на сваю першую настаўніцу, я ўжо тады цвёрда вырашыла — ўсё, абавязкова стану настаўніцай пачатковых класаў! — успамінае Ірына. — Але праз некаторы час я пайшла вучыцца ў музычную школу. Там і зразумела, што хачу стаць настаўніцай музыкі». У выніку ж Ірына адразу здзейсніла і першую, і другую мары. Таму што скончыла Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка і стала настаўніцай пачатковай школы і ўрокаў музыкі.

У час вучобы дзяўчына канчаткова пераканалася, што выбар зрабіла правільны: гэта выдатна пацвердзілі дзве педагагічныя практыкі ў дзіцячым аздараўленчым лагеры «Гарызонт», куды накіроўвалася Ірына Лукашэвіч. Праца з дзецьмі прыносіла радасць, жаданне працаваць далей і шукаць усё новыя падыходы да выхавання школьнікаў.

...У тым годзе накіраванне на працу ў Мінск было ўсяго адно. Вось тут і спатрэбіўся Ірыне яе «чырвоны» дыплом: шчаслівы білет дастаўся старэйшай студэнтцы Лукашэвіч. Працаваць жадзяўчына накіравалася ў гімназію № 56 горада Мінска.

Два гады працы педагогам-арганізатарам праляцелі хутка. Калегі не нахваляцца. «Ірына ў нас дзяўчына творчая, таленавітая, ініцыятыўная. Ды і проста цікавы і прыемны чалавек!» — прызнаецца Святлана Васільеўна Камушэнка, намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце гімназіі № 56.

Зараз Ірына Аляксандраўна, як звяртаюцца да яе дзеці, — кіраўнік хору пачатковых класаў. А гэта ні многа ні мала 26 маленькіх хлопчыкаў і дзяўчынак, да кожнага з якіх трэба знайсці падыход, навучыць, дапамагчы, зразумець... І разгледзець таленты таксама трэба! Яшчэ адна пачэсная місія — кіраўніцтва вакальнай групай з 5 дзяўчат старэйшых класаў. Дадайце сюды падрыхтоўку і правядзенне шматлікіх святаў, канцэртаў, мерапрыемстваў — і вы атрымаеце тыповую карціну няпростай працы педагога-арганізатара. Адкуль толькі сілы на ўсё бяруцца? У адказ Ірына весела прызнаецца: «Не ведаю, як іншым, але мне праца з дзецьмі настрой толькі ўзнімае. У маленькіх — проста неверагодная колькасць станоўчай энергіі. Гэта так прыемна адчуваць! І не трэба казаць, што дзеці бываюць злыя. Проста ў некаторых недахопах нашых дзяцей ёсць і віна бацькоў. На жаль... Бо дзеці самі па сабе дрэннымі не бываюць! Для педагога ж, мабыць, самае галоўнае — гэта зразумець маладога чалавечка, адчуць яго душу!»

...Мы сядзім з Ірынай на сініх канапах ва ўтульным блакітным пакоі за шкляным столікам і

ЛЮБІМЫЯ...

Пара года — вясна
Краіна — Беларусь
Колер — блакітны, сіні
Горад — яны ўсе прыгожыя. Кожны па-свойму
Кампазітар — Моцарт
Фільм — «Москва слезам не верит»

ціха разважаем пра сучасную школу, дзяцей, мары. На маё пытанне, што не пашкодзіла б змяніць у сучаснай школе, Ірына задумваецца. «Ведаеце... Нам бы хоць крышачку «разгрузіць» нашых дзетак! Але каб на паспяховасці і на выніках прадметных алімпіяд гэта не адбілася негатыўна. Тады б дзеці маглі больш часу траціць на адпачынак і на самавыхаванне. А гэта б пайшло на карысць і самім школьнікам, і іх бацькам, і настаўнікам», — разважае Ірына.

А пра самавыхаванне і рознабаковыя інтарэсы Ірына ведае не выпадкова: чым толькі не займалася яна ў дзяцінстве! І дзе толькі не праяўляла свае здольнасці! У школе дзяўчынка асабліва любіла рускую літаратуру, да таго ж цудоўна спявала, іграла на фартэпіяна, паспяхова займалася харэаграфіяй, вучылася ў мастацкай студыі. А аднойчы, пасля нейкага чарговага конкурсу альбо свята прызналася маме, што хоча быць... рэжысёрам! Ці то пажартаваўшы, ці то сур'ёзна маці параіла стаць лепей педагогам: «Там, дачушка, будзеш і рэжысёрам, і сцэнарыстам...» І як у ваду глядзела! Дарэчы, у сваёй сям'і Ірына — адзіны педагог. Затое які — лепшы ва ўсёй краіне!

...І вось тут наша размова плаўна вяртаецца да нядаўніх падзей у ліцэі БДУ, дзе на працягу трох дзён праходзіў рэспубліканскі конкурс «Педагог-арганізатар года-2006». «Але ж такой мэты — абавязкова стаць першымі — мы не ставілі. Тым больш што канкурэнтаў, прычым вельмі дастойных, было сапраўды шмат. Я проста хацела выступіць так, каб гораду Мінску не было за мяне сорамна! Першае месца... Значыць, сорамна за нас сапраўды не было! Усё атрымалася!» — у ясных блакітных вачах Ірыны іскрыцца шчаслівая ўсмешка.

...Ну і, канешне ж, мары. Лепшы педагог-арганізатар Беларусі сёння марыць проста павялічыць дзень, каб паспяваць яшчэ больш. «Калі ж сур'ёзна, то зараз я рэалізоўваю сябе цалкам, а таму і задаволена».

На гэтым наша размова падыходзіць да лагічнага завяршэння. Ірына спяшаецца вярнуцца да працы — сцэнарый навагодніх прыгод рыхтуецца самымі актыўнымі тэмпамі. Ёсць у педагога-арганізатара такая прыемная адказнасць — сумленна і творча працаваць, каб потым нашы дзеці адпачывалі. Час, практыка і рэспубліканскі конкурс даказалі — у Ірыны Лукашэвіч гэта атрымліваецца «на дзесятку»!

Алена БАРЫСЕВІЧ.

УПЕРШЫНЮ — ЗА ПАРТУ

Фота Аляксандра ХІТРОВА, БЕЛТА.

Першыя беларускія словы Зуліжы.

У Віцебску ў адзіную ў Беларусі агульнаадукацыйную школу, дзе навучаюцца дзеці бежанцаў, прыбылі новыя вучні — сёстры Махамед з Афганістана. Старэйшая з сясцёр 10-гадовая Зуліжа вучылася ў афганскай школе, а 8-гадовая Фахраш і 6-гадовая Фаіма селі за парту ўпершыню. Заняткі з вучаніцамі праводзяцца індывідуальна, і пакуль перад іх педагогам Вольгай Бадровай стаіць задача навучыць дзяўчынак разумець мову чужой краіны і гаварыць на ёй. Па рашэнню бацькоў дзяўчынак вучаць рускай мове. Разам з дочкамі займаецца бацька Шах Махамед. Сямейства Махамед прыехала ў Беларусь два месяцы таму і да атрымання статуса бежанцаў пражывае ў пункце часовага размяшчэння бежанцаў, які адкрыўся некалькі гадоў таму пры падтрымцы камісарыята ААН у Віцебску. Сярэдняя школа № 19 пяты год працуе з дзецьмі з сем'яў перамешчаных асоб у адпаведнасці з пагадненнем паміж упраўленнем вярхоўнага камісара па справах бежанцаў ААН і камітэтам па працы і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама. За гэты час тут разам са звычайнымі вучнямі, а іх у школе 288, вучыліся дзеці з Малдовы, Азербайджана, Дагестана, Абхазіі, Афганістана.

Рашэнне аб навучанні дзяцей у сярэдняй школе прымаюць толькі бацькі. Падчас работы з дзецьмі бежанцаў педагогі стараюцца ўлічваць этнічныя, нацыянальныя і рэлігійныя асаблівасці сваіх вучняў. Кантынгент вучняў з сем'яў бежанцаў пастаянна мяняецца: хтосьці з дзяцей вучыцца некалькі месяцаў, хтосьці — некалькі гадоў, рэдка ў каго з іх вучэбны год пачынаецца 1 верасня.

Здароўе

У Вялікабрытаніі забароняць рэкламу фаст-фуду ў дзіцячых перадачах

Чалавецтва стаіць на парозе глабальнай эпідэміі дыябету, якая пагражае жыццю і здароўю 400 мільёнаў чалавек. З такой заявай выступіў на канферэнцыі IDF у Кейптаўне прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі дыябету П'ер Лефеўр. У афіцыйнай заяве федэрацыі падкрэсліваецца, што эпідэмія дыябету фактычна выйшла з-пад кантролю і сусветная «армія» дыябетыкаў дасягнула ўжо 246 мільёнаў чалавек, перавысіўшы самыя песімістычныя прагнозы. Да таго ж нездаровая ежа і пасіўны лад жыцця імкліва амаладжаюць гэту хваробу, якая ахоплівае ўсё больш маладыя ўзроставыя групы. Атлушчэнне дзяцей і падлеткаў у апошнія 10—20 гадоў прагрэсіруе проста фантастычнымі тэмпамі...

Аб'явіць вайну нездаровай ежы збіраюцца на тэлебачанні ў Вялікабрытаніі. Брытанскі наглядны орган Ofcom са студзеня 2007 года ўводзіць забарону на рэкламу ў тэлевізійных праграмах, разлічаных на гледачоў да 16 гадоў, ежы з павышаным утрыманнем тлушчу, солі і цукру. Пры складанні пераліку забароненых прадуктаў будуць выкарыстоўвацца рэйтынгі Еўрапейскага агенцтва па стандартызацыі прадуктаў харчавання. Забарона распаўсюдзіцца на дзіцячае кабельнае і спадарожнікавае тэлебачанне, дзіцячыя перадачы на цэнтральных каналах, музычныя шоу для падлеткаў, а таксама на ўсе забаўляльныя праграмы, якія карыстаюцца павышанай папулярнасцю ў гледачоў да 16 гадоў. У бліжэйшых планах значыцца таксама ўвядзенне забароны на рэкламныя акцыі з бясплатнай раздачай прадуктаў і выкарыстанне ў рэкламе знакамітых асоб і папулярных персанажаў.

Шэраг грамадскіх арганізацый, уключаючы Брытанскую медыцынскую асацыяцыю, лічаць гэтыя меры недастатковымі і патрабуюць поўнасцю забараніць рэкламу шкоднага фаст-фуду на тэлебачанні ў дзённы час.

Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.

Моладзь — на старт!

Як паведамілі ва ўпраўленні ідэалагічнай работы Мінскага аблвыканкама, 15—16 снежня на вучэбна-спартыўнай базе «Вілія» Маладзечанскага раёна пройдзе першая адкрытая зімовая спартакіяда працоўнай моладзі.

Арганізатарамі акцыі выступілі Мінскі абласны камітэт грамадскага аб'яднання Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, упраўленне па фізічнай культуры, спорту і турызму, аддзел моладзі аблвыканкама, а таксама арганізацыйная структура па Мінску і сталічнай вобласці дзяржаўна-грамадскага аб'яднання ДТСААФ. У складзе каманд — 10 чалавек, узрост удзельнікаў павінен быць не менш чым 18 гадоў. Пераможцы ў розных намінацыях будуць узнагароджаны пераходзячымі кубкамі, медалямі і каштоўнымі прызамі.

Падчас спартакіяды плануецца правесці розныя спартыўныя спаборніцтвы, жартоўныя эстафеты, конкурсныя і канцэртныя праграмы, дыскатэку. Таксама адбудзецца тэматычны «круглы стол» «Праблемы моладзі на сучасным этапе».

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

ДЫПЛОМ БДУ — УНІВЕРСАЛЬНЫЯ ВЕДЫ, або Жыццё бліжняга ў тваіх руках

«Навошта нам, гісторыкам, вывучаць медыцыну...», — выпадкова пачула спрэчку двух студэнтаў у грамадскім транспарце. Канцавы прыпынак. А хлопцы так і не прыйшлі да агульнай думкі. Вось так нечакана і нарадзілася тэма для матэрыялу. Сапраўды, узнікае пытанне: ці патрэбна студэнтам не медыцынская прафілю «забіваць галаву» лішняй інфармацыяй? А за адказам я накіравалася на кафедру грамадскага здароўя і аховы здароўя БДУ.

Даўрачэбную дапамогу павінен умець аказаць кожны

Кафедра грамадскага здароўя і аховы здароўя існуе ў БДУ ўжо 37 гадоў. Яна выконвае не толькі педагагічныя функцыі па падрыхтоўцы студэнтаў да экстрэмальных сітуацый, але і ўдзельнічае ў розных праграмах па фарміраванню грамадскага здароўя. Выкладчыкі кафедры чытаюць лекцыі па асноўных пытаннях даўрачэбнай дапамогі не толькі студэнтам, але і сваім калегам. Безумоўна, важна, каб супрацоўнікі БДУ таксама маглі аказаць дапамогу сабе і навакольным.

Выкладаецца дысцыпліна на 11 педагагічных і гуманітарных факультэтах.

— Студэнты факультэтаў, якія не вывучаюць медыцыну, таксама прыходзяць да нас і просяць дазволу наведваць лекцыі на правах вольных слухачоў, — расказвае загадчык кафедры і выкладчык Галіна Бацян. — Яны разумеюць, што гэтыя веды спатрэбяцца ім у жыцці. У неадкладнай сітуацыі аказаць першую медыцынскую дапамогу павінен кожны. Хацелася б, канешне, каб наш прадмет вывучалі студэнты ўсіх факультэтаў.

Медыцына проста не можа быць несур'ёзнай

Па вучэбнай праграме студэнты вывучаюць такія дысцыпліны, як даўрачэбная дапамога пры захворваннях унутраных органаў і атручваннях, даўрачэбная дапамога пры хірургічных захворваннях і траўмах, ахова мацярынства і дзяцінства, інфекцыйныя захворванні і дзіцячыя інфекцыі, іх прадухіленне і неадкладная дапамога.

— Часцяком складана зацікавіць студэнтаў, — зазначае Галіна Міхайлаўна. — На факультэтах існуе такое меркаванне, што паколькі медыцына прадмет не асноўны, то і ставіцца да яго патрэбна як да другараднага. Мы спрабуем абвергнуць гэтую думку. Упэўнена, што несур'ёзнай медыцыны не бывае. Калі я, напрыклад, не змагу спыніць крывацёк і на маіх вачах загіне чалавек, то буду вінавата толькі я, і ніхто іншы.

Жыццёвы вопыт без дыскрымінацыі па палавой прымеце

Займаюцца медыцынай як дзяўчаты, так і хлопцы, якія не прайшлі конкурс на ваенную падрыхтоўку.

Хлопцы ж, на самай справе, павінны ведаць спецыфіку аказання даўрачэбнай дапамогі (накладання шын, спынення крывацёку і іншае) яшчэ ў большай ступені, чым дзяўчаты, бо гэта, часам, патрабуе немалой фізічнай сілы.

— Акрамя гэтага, нашы студэнты ўмеюць рабіць ін'екцыі, вымяраць артэрыяльны ціск, дыягнаставаць розныя неадкладныя станы арганізма, даглядаць хворых, ведаюць, што рабіць падчас цяжарнасці, як абыходзіцца з немаўлятамі, — пераконвае Галіна Міхайлаўна. — Кожны занятак папаўняе жыццёвы вопыт, таму, калі студэнт яго прапускае, то абавязкова павінен азнаёміцца з выкладзенай інфармацыяй самастойна і прадэманстраваць свае веды выкладчыку. Наогул, калі я прыйшла працаваць у БДУ з Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, дзе даводзілася выкладаць не студэнтам, а дактарам-практыкам, то здзівілася, наколькі шырока ахоплены ўсе пытанні медыцыны для студэнтаў — не медыкаў.

— Студэнты, пакуль маладыя, не вельмі часта задумваюцца пра сваё здароўе, не берагуць яго...

— Недзе каля паловы выпускнікоў школ, якія паступаюць у БДУ, яшчэ ў дзяцінстве набылі шэраг захворванняў, якія мы збіраемся абмяркоўваць на занятках. Менавіта тут яны і атрымаюць больш падрабязную інфармацыю аб асноўных сімптомах гэтых захворванняў, іх профілактыцы і даўрачэбнай дапамозе.

Не ўсе веды, якія студэнты вынесуць са сцен універсітэта, могуць спатрэбіцца ім у рабоце, — дзеліцца сваімі думкамі Галіна Міхайлаўна. — А вось інфармацыя пра тое, як даглядаць дзяцей, дапамагаць у час хваробы родным, заўсёды акажацца неабходнай. Цыкл лекцый аб здароўі студэнты павінны ўспрымаць як падарунак. Далёка не ўсе маюць магчымасць яго праслухаць. У заходнееўрапейскіх краінах, напрыклад, людзі плацяць грошы за такі курс лекцый.

Ахвотнікаў на яго запісацца нямала: гэта супрацоўнікі камп'ютарных кампаній, гіпермаркетаў, аэрапортаў, тых арганізацый, якія абслугоўваюць вялікую колькасць кліентаў.

Ісці ў нагу з часам — мара кафедры

БДУ займаецца праблемамі здароўя з дня свайго заснавання.

— У сувязі з гэтым, нашы магчымасці на сёння даволі высокія, — адзначае Галіна Бацян. — Але, каб перайсці на ўзровень XXI стагоддзя, трэба арганізаваць вучэбныя класы, абсталяваныя па-сучаснаму — муляжамі, вучэбнымі фільмамі. На сёння гэта зрабіць немагчыма: кафедра не мае пастаянных вучэбных класаў. Праводзім заняткі са студэнтамі ў размешчаных па ўсяму гораду карпусах факультэтаў. Гэтыя пытанні, спадзяёмся, будуць вырашаны з увядзеннем новых будынкаў.

Не лыкам шытыя

На кафедру грамадскага здароўя і аховы здароўя БДУ прыходзяць лісты-падзякі не толькі ад выпускнікоў, але і ад людзей, якім даводзілася з імі працаваць. Адзін з іх, напрыклад, ад дырэктара Дома адпачынку для дзяцей і студэнтаў з Германіі.

— Нашы выпускніцы ездзілі туды з дзецьмі з чарнобыльскай зоны ў якасці выхавальніц, — з гонарам расказвае выкладчык тэрапіі Станіслаў Суднік. — Немцы ўдзячны нам за студэнтак, якія на прафесійным узроўні здольныя аказаць дапамогу пры страце прытомнасці, крывацёках.

З Польшчы таксама прыйшла падзяка ажно на дзве старонкі. Там не нарадуюцца на нашых дзяўчат, якія валодаюць выхаваўчымі навыкамі па здароваму ладу жыцця: чытаюць дзецям матэрыялы аб шкодзе курэння, невыкананні рэжыму харчавання.

Двое нашых студэнтаў вярнуліся з Амерыкі і адразу ж завіталі да нас, каб сказаць «дзякуй» за атрыманыя навыкі. Проста там, акрамя ведання замежнай мовы, абавязковым крытэрыем для таго каб стаць выхавальнікам, з'яўляецца праходжанне курса медыцынскай падрыхтоўкі. Тым, хто не вывучаў медыцыны, не пашанцавала: ім даводзілася працаваць на кухні ці ў дварэ з венікам.

БДУ рыхтуе ўніверсальных спецыялістаў

Само слова ўніверсітэт падразумявае ўніверсальную адукацыю, а не вузка абмежаваныя прафесійныя навыкі. Цяжка назваць чалавека пісьменным, калі ён не валодае элементамі этычных навыкаў. Правільна апрануцца, сервіраваць стол, авалодаць камп'ютарам і замежнай мовай — гэта элементарныя патрабаванні цывілізацыі. Сярод іх важнае значэнне мае аказанне першай даўрачэбнай дапамогі. Гэта звязана, у першую чаргу, з павелічэннем колькасці траўмаў, атрыманых у выніку аўтамабільных катастроф, аварый тэхнагеннага характару.

— Паверце, здароўе грамадзян не можа быць забяспечана толькі за кошт працы медыцынскіх устаноў, — пераконвае выкладчык хірургіі Эдуард Ліпень. — Нават нягледзячы на тое, што наша дзяржава надае вялікае значэнне ўдасканаленню ўмоў аховы здароўя, часам урачы аказваюцца бездапаможнымі, калі чалавеку своечасова не аказаць першай даўрачэбнай дапамогі ці зрабіць гэта няправільна. Напрыклад, пры паражэнні электрычным токам ці ўтапленні наіўна спадзявацца, што праз пяць хвілін прыедзе «хуткая дапамога». Тут усё залежыць ад чалавека, які знаходзіцца побач, незалежна ад яго прафесіі. Бывае так, што праз 10 хвілін такая дапамога ўжо не патрэбна.

Каб не паўтарыць чужых памылак...

Эдуард Бернардавіч мае багаты вопыт клінічнай працы. Чаго толькі не даводзілася бачыць яму за гэты час: сапраўды, недахоп навыкаў па аказанню даўрачэбнай дапамогі можа пакалечыць жыццё блізкага чалавека.

■ *Маці з сынам пайшлі ў грыбы. Хлопчык заваліўся і параніў нагу. Жанчына з падручных сродкаў зрабіла жгут, які наклала няправільна. Тут, на жаль, не дапамагло веданне трох замежных моў і дзве вышэйшыя адукацыі. Хлопчык праляжаў са жгутом, замест адной гадзіны цэлых тры. Такім чынам, няправільнае спыненне крывацёку на даўрачэбным этапе пры бытавой траўме прывяло да ампутацыі ніжняй канечнасці.*

Часта дзеці паступаюць у хірургічны аддзел з ускладненым апендыцытам, які «выгадавалі» дома бабулі ці маці.

■ *Аднойчы бабуля, каб дапамагчы ўнуку, якому балеў жывот з правага боку, прыклала гарачую грэлку. Такім чынам яна заўсёды знімала боль сабе. У яе была жоўцекамянёвая хвароба. Апендыцыт выспеў да гангрэны, лопнуў, з'явіўся перытаніт. Зрабілі аперацыю, унук застаўся жыць. Але замест 30 хвілін хлопчык мучыўся тры гадзіны.*

Надзея ДРЫЛА.

І адукацыя, і спецыяльнасць

Дзень абаронцы Айчыны ў Гродзенскім тэхналагічным каледжы па традыцыі адзначаюць конкурсам «Ану, хлопцы», а дню святога Валянціна прысвячаецца конкурс «Ану, парачкі».

У каледжы, якому сёлета споўнілася 40 гадоў з дня заснавання, падрыхтавана больш за 11 тысяч спецыялістаў. Цяпер ён мае статус структурнага падраздзялення Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы і, такім чынам, праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі інтэгруюцца з праграмамі вышэйшай адукацыі. Выпускнікі могуць не толькі працаваць кіраўнікамі сярэдняга звяна, але і атрымліваюць адну-дзве рабочыя спецыяльнасці. Сёння ў каледжы 4 камп'ютарныя класы з выхадам у Інтэрнэт, 21 лабараторыя, а бібліятэка налічвае больш за 60 тысяч кніг.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Новая зорка — на Лідчыне

Беларусь вельмі багатая на прыгажунь, але, мусіць, адны з самых чароўных дзяўчат жывуць на Лідчыне.

Нядаўна лідчанка Алена Седзяк, пераможца конкурсу «Міс Лідчына-2004», атрымала прызнанне і на рэспубліканскім узроўні. На пятым Нацыянальным конкурсе прыгажосці «Міс Беларусь-2006» яна была ўдастоена званняў «Другая віцэ-Міс» і «Міс глядацкіх сімпатый».

І вось — новая зорка на лідскай зямлі, якую вызначыла ўжо традыцыйная раённая шоу-праграма «Міс Лідчына-2006». Конкурс прайшоў у тры этапы. Першы — «Знаёмства», другі — «Нацыянальны касцюм», а на трэцім этапе ўдзельніцам прапанавалася з дапамогай убору адлюстраваць рысы свайго характару. Дзяўчаты праявілі сябе і ў трох дэфіле: «Купальнік», «Кветкавая фантазія» і «Вячэрні экспромт». Пераможцай конкурсу стала адзінаццацікласніца СШ № 9 Вольга Муліца, прычым яна заслужыла сімпатыі не толькі журы, але і гледачоў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Бульбяное!!! Шоу!!!

І КЕПКУ АД «ЗВЯЗДЫ» НА ПАМЯЦЬ

Вясёлае маладзёжнае мерапрыемства «Бульбяное шоу» адбылося ў Віцебску ў культурна-дзелавым цэнтры «Віцебск». Адным з інфармацыйных партнёраў «свята бульбы» была наша «Звязда». А як жа без нас!? Рэдакцыя таксама падрыхтавала для розыгрышу ў адным з конкурсаў гэтага незвычайнага свята спецыяльны і вельмі карысны сюрпрыз.

13 снежня стала шчаслівым днём для студэнтаў Віцебшчыны, якія ў гэты дзень на «Бульбяным шоу» падводзілі вынікі сёлетняга працоўнага семестра. Шоу арганізавалі Віцебскі абласны камітэт БРСМ і аддзел па справах моладзі аблвыканкама.

Першы сакратар абкама БРСМ Руслан Вінакураў павіншаваў хлопцаў і дзяўчат з паспяховай работай у складзе будаўнічых, экалагічных, валанцёрскіх, педагагічных атрадаў, а таксама тых «байцоў», якія працавалі па заданнях цэнтраў занятасці насельніцтва... Дарэчы, афіцыйная частка мерапрыемства не вельмі надакучала, бо паміж момантамі ўручэння самым лепшым самых розных прызоў праводзілі самыя розныя конкурсы сярод маладых гасцей свята (а такімі былі амаль усе). Падчас першага гумарыстычнага конкурсу было даручана яго ўдзельнікам хутчэй за астатніх «падпісаць» публіку на газеты. Самым працаздольным «паштальёнам» аказалася вельмі сціплая і прыгожая дзяўчына — будучы інжынер-тэхнолог, студэнтка Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Вера Ермаковіч, якая вучыцца на 2-м курсе. Менавіта яна і атрымала ад арганізатараў нашу «звяздоўскую» кепку, што вельмі ёй будзе патрэбна, калі летам вырашыць папрацаваць у маладзёжным атрадзе.



Студэнты з віцебскіх і полацкага ВНУ гулялі ў КВЗ, прадэманстравалі майстэрства ўсходніх танцаў, брэйк-данса, усяго за некалькі хвілін здолелі стварыць адзенне з газет... Успаміналі назвы страў з бульбы і г.д. Дзве гадзіны шоу прайшлі «імгненна». Асабліва спадабаліся гледачам іншаземныя студэнты: тры будучыя медыкі выконвалі танцы, якія можна ўбачыць ў індыйскіх фільмах, але ж у сучасным «афармленні».

У кулуарах актывісты і кіраўнікі маладзёжных атрадаў сціпла давалі журналістам інтэрв'ю, ну як пачынаючыя «зоркі» шоу-бізнэсу! Мне было прыемна пазнаёміцца з лепшым камандзірам студэнцкага будаўнічага атрада імя П.М. Машэрава Алегам Шнітко **(на фота)**. Пад яго кіраўніцтвам «байцы» ажыццяўлялі рэканструкцыю віцебскай біяфабрыкі ў вёсцы Доўжа Віцебскага раёна. У выніку зарплата склала ад 750 да 840 тысяч рублёў (на падсобных работах)... Так што зарабілі вельмі добра! Гэта ж колькі стыпендый атрымліваецца!?

Арганізатары паабяцалі, што «Бульбяное шоу» абавязкова пройдзе і ў наступным годзе . Зараз актыўна аднаўляюцца добрыя традыцыі камсамолу ў гэтым накірунку. Як бацькі і дзяды калісьці, новае пакаленне жадае выпрабаваць свае сілы ў напружанай рабоце. І зноў моладзь успомніць цікавы час сумеснай работы — карыснай і для сабе і для дзяржавы!

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«Сапегаўскія чытанні» на факультэце права

На працягу двух дзён, 13 і 14 снежня, факультэт права Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта адзначаў 440-годдзе выдання II Статута Вялікага княства Літоўскага 1566 года.

Ініцыятарам гэтага мерапрыемства стала дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі права Анфіса Ляднёва, якая з дапамогай выкладчыкаў арганізавала ў гэтым годзе гурток тэарэтыка-прававых і гісторыка-прававых ведаў.

— У гэтым годзе своеасаблівы юбілей — 440 гадоў з дня выдання II Статута ВКЛ 1566 г., — расказвае Анфіса Сямёнаўна. — А Сапега — выдатная асоба, юрыст, нават гісторык! Мы не маглі абмінуць яго. У нас нават сімвалічная назва — «Сапегаўскія чытанні».

На пачатку мерапрыемства праходзіла канферэнцыя, прысвечаная Статутнаму праву. Дзевяць самых лепшых хлопцаў і дзяўчат прадставілі цікавыя даклады, напрыклад «Скасаванне шлюбу паводле статутаў ВКЛ», «Смяротнае пакаранне па Статуту 1588 г. і на сучасным этапе». Самыя лепшыя былі адзначаны дыпломамі і каштоўнымі падарункамі.

Але ж студэнты не толькі добра вучацца, але і добра адпачываюць! І таму на працягу дзвюх гадзін ужо не студэнты, а прыгожыя пані і паненкі ў сярэднявечных строях танцавалі, спявалі песні, чыталі вершы... І ўсё гэта разам з жартамі, смехам і добрай музыкай.

На другі дзень, 14 снежня, 6 каманд у інтэлектуальнай гульні «Брэйн-рынг» змагаліся за званне самых лепшых знаўцаў права ў сярэднявеччы. Пасля — тэатралізаванае прадстаўленне «Крымінальны працэс у ВКЛ у XVI ст.».

— Гэта вельмі цікавыя дні ў гісторыі факультэта! — сакрэтнічаюць са мною студэнты. — Мы паспяваем і вучыцца, і вельмі добра адпачыць. Нас гэта вельмі захапіла: рэпеціравалі да 9 гадзін вечара, пасля прыходзілі дадому, а ў галаве — як тоесёе дарабіць, зрабіць лепшым. Мы вельмі спадзяёмся, што гэта стане добрай традыцыяй.

Марына БЕГУНКОВА. Фота аўтара.

П'едэстал

САМАЕ КАШТОЎНАЕ «ЗОЛАТА» ТАЦЦЯНЫ МАСКВІНОЙ

Яна калекцыянуе слонікаў, акуляры і медалі. Наконт колькасці першых дзвюх рэчаў дакладна не ведаю, а вось залатых узнагарод у самбісткі сабралася ўжо дзесяць. Праўда, Таццяна Масквіна сцвярджае, што самае каштоўнае ў яе жыцці «золата» здабыта не на чэмпіянатах свету: сёлета, у Год маці, у спартсменкі нарадзілася дачушка. З гэтай нагоды і пачалася наша размова:

Фота БЕЛТА.

— Дзіця ў мяне было запланавана і таму стала доўгачаканым і, як кажуць, у тэму, пасля медалёвага юбілею. Шанталь — маё чарговае «золата». Праўда, прыгожае спалучэнне — Шанталь Шціль? — для Таццяны гэта пытанне рытарычнае, ды і, здаецца, аб сваёй дачушцы яна можа расказваць гадзінамі. — Самае смешнае: калі дачцэ споўнілася два месяцы, мы прыйшлі ў паліклініку, і ўрач паведаміў, што гэта ўжо другая Шанталь за дзень (раней прыходзіла нямецкая дзяўчынка). У нас таксама тата з Германіі, таму і імя замежнае.

— Ці мае нейкае дачыненне да спорту бацька Шанталь?

— Па прафесіі ён будаўнік. Раней, як усе немцы, з задавальненнем гуляў у футбол, але парваў звязкі ў калене і на гэтым давялося спыніцца. Зараз ён мае дачыненне да спорту як спонсар каманды па дзюдо, за якую я выступаю, — «Дынама-Брандбург». Дарэчы, у Германіі гэты від спорту вельмі любяць: дзюдо на другім месцы па папулярнасці пасля футбола. Гэта трэба бачыць: поўныя трыбуны, усе «хварэюць» вельмі тэмпераментна. Калі суддзя няправільна ацэньвае дзеянні спартсмена, на татамі з залы ляціць усё, што магчыма.

— Улічваючы, што ваш выбраннік жыве ў Германіі, не магу не пацікавіцца: ці збіраецеся прадстаўляць на чэмпіянатах і Алімпіядзе гэту краіну? Ёсць прыклады, калі спартсменка пераязджала за мяжу і працягвала выступаць за Беларусь (веславальшчыца Кацярына Карстэн), ці, наадварот, абараняла колеры чужога сцяга (плыўчыха Алена Попчанка).

— Чаму так атрымалася з Ленай, ведаю, бо мы сябруем. Яна вельмі хацела выступаць за Беларусь, але ў краіне тады не было патрэбных умоў. Сапраўды, ёсць шэраг прыкладаў, калі спартсмены трэніруюцца за мяжой, а прадстаўляюць нашу краіну. Узгадаем хоць бы Ваню Іванкова. Што датычыцца мяне, то не змагу выступаць на Алімпіядзе за іншую дзяржаву, бо ў мяне амаль 20 гадоў прафесійнай кар'еры ў Беларусі, ды і зараз кіраўніцтва рэспублікі робіць усё магчымае для спартсменаў, каб нам было камфортна і ўтульна трэніравацца і спаборнічаць.

— У асноўным спартсмены імкнуцца завяршаць сваю кар'еру на аптымістычнай ноце. Вы ўжо дзесяць разоў станавіліся мацнейшай у свеце, сёлета здабылі новы тытул — маці і ёсць падстава пакінуць спорт прыгожа...

— Нараджэнне дзіцяці для любой жанчыны — самы важны крок, які трэба зрабіць у сваім жыцці. Зараз я лічу сябе паўнацэнным чалавекам. Мне ўжо не сорамна перад Госпадам і перад сабой. Аднак напярадзе Алімпіяда ў Пекіне, таму завяршаць сваю кар'еру я пакуль не збіраюся. Дзякуючы маці, якая можа пасядзець з дачкой, я магу працягваць трэніроўкі і зарабляць грошы.

— Некаторых жанчын пужае цяжарнасць з-за таго, што можна распаўнець. У вашым відзе спорту наогул вельмі важна прытрымлівацца пэўнай вагі (вагавая катэгорыя Таццяны 48 кілаграмаў). Цяжка было не згубіць форму?

— Хачу сказаць усім жанчынам на будучае: нельга прыкрывацца сваёй цяжарнасцю, быццам мне дазваляецца есці ўсё, калі хочацца. Трэба рабіць тое, што карысна дзіцяці, а сябе стрымліваць. Дыета для падтрымання формы — не самае галоўнае, важны і кантроль над сабой. Вялікае значэнне мае і канстытуцыя жанчыны, таму нельга бегчы на смачны пах і з'ядаць шмат пірожных, калі вы схільныя да паўнаты. Я трымала сябе ў форме, таму лішнія кілаграмы мяне не пужалі.

— Ці праўда, што вы нават бегалі кросы на чацвёртым месяцы цяжарнасці?

— Прафесійныя спартсменкі трэніруюцца і ў гэты тэрмін. Я не выключэнне, бо калі жанчына біялагічна здаровая, на чацвёртым месяцы цяжарнасці плоду нічога не пагражае нават пры інтэнсіўных занятках спортам. Гэта, наадварот, вельмі карысна, бо ў кроў выдзяляецца гармон дабрыні, з'яўляецца цудоўны настрой. Адзінае, што мой від дастаткова траўматычны (удары трапляюць і ў жывот), таму я ўжо не займалася на татамі, а бегала кросы ў добрым тэмпе да шасці месяцаў. Нават з большай хуткасцю, чым дагэтуль. У мяне з'явілася шмат дадатковай сілы.

— Значыць, цяжарнасць сапраўды спрыяе рэкордам і дасягненням у спорце?

— Спецыялісты ведаюць, што праз год пасля цяжарнасці пачынаецца пік фізічнай актыўнасці, бо аднаўляецца кроў, павышаецца гарманальны фон, тонус жанчыны. Як правіла, усе спартсменкі пры такой форме выступаюць лепей, чым раней.

— Барацьба не надта жаночы від спорту. Чаму вы выбралі яго?

— У некаторых спартсменак такі стыль барацьбы, што яны пастаянна ходзяць з сінякамі. Гэта, канешне, выглядае не па-жаноцку. Аднак мне падабаецца кантактны від барацьбы. Спачатку мяне з пяці гадоў маці насіла на спартыўную гімнастыку, бо хадзіць туды я катэгарычна адмаўлялася. Бацькоў радавала, што пасля трэніровак я сябе паводзіла спакойна *(узгадвае з усмешкай)*. У залу барацьбы я трапіла «за кампанію», ды і мода тады прыйшла на самба, дзюдо. Чаму так і засталася ў барацьбе? Яна загартоўвае характар. Магу за сябе пастаяць і яшчэ за таго хлопца. На шчасце, па-за спаборніцтвамі не даводзілася абараняцца. У мяне, пэўна, такі выгляд, што ніхто нават не хоча мяне пакрыўдзіць. Мяне, дарэчы, мала хто асацыіруе з самбісткай ці дзюдаісткай, быццам барцы павінны заўжды быць вялікімі і тоўстымі. Калі ж людзі даведваюцца, што я яшчэ і дзесяцікратная чэмпіёнка свету, у іх шок. Мне даводзіцца іх супакойваць: ёсць жа розныя вагавыя катэгорыі.

Шанталь з бацькам, Карстэнам Шціле: апетыт выдатны!

— У вас болей поспехаў у самба, а наогул: вам бліжэй самба ці дзюдо?

— Канешне ж, самба — наш родны від спорту. Шкада, што яго так і не ўключылі ў алімпійскую праграму. Хацелі ж у 80-я гады гэта зрабіць, але не атрымалася. Мы ўсё сваё добрае чамусьці заўжды хаваем, хоць ёсць цудоўныя традыцыі, а прыжываецца замежнае. Самба — вельмі прыгожы від спорту, ён створаны з нацыянальных відаў барацьбы. Калі ж з Японіі прыйшло дзюдо, то ў яго перакачавалі амаль усе самбісты. Зараз усё змяшалася: нашы спартсмены выступаюць на спаборніцтвах і па дзюдо, і па самба, але дзюдо — алімпійскі від, таму яму аддаюць перавагу.

— Набліжаецца Новы год. Дзе плануеце яго сустракаць?

— У рэстаран ці да сяброў пайсці не змагу, бо, наколькі ведаю, маленькіх дзяцей нельга пакідаць адных у навагоднюю ноч, гэта дрэнная прыкмета. Буду дома, таму паспрабую як мага лепей упрыгожыць кватэру, каб было прыгожа і ўтульна.

— Дзякуй за гутарку! Шчасця вам у новым годзе і ўдачы на спаборніцтвах.

Размаўляла Ірына ПРЫМАК.

МАТЭМАТЫКА З «МАСТАЦКІМ УХІЛАМ»

З 9 па 12 снежня па ініцыятыве факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ ў Мінску прайшоў восьмы адкрыты рэспубліканскі турнір юных матэматыкаў.

За выхад у фінал турніру змагаліся 14 каманд школьнікаў з Мінска, Баранавіч, Кобрына, Віцебска, Гродна, Гомеля, а таксама каманды з Расіі і Казахстана. Ад юных матэматыкаў патрабавалася прадэманстраваць уменне рашаць даследчыя задачы, наглядна прадстаўляць атрыманыя вынікі і аргументавана адстойваць свой пункт погляду ў публічных дыскусіях. Перамогу ў сёлетнім турніры падзялілі паміж сабой каманда Ліцэя БДУ і каманда сталічнай школы № 41. Прыкмячальна, што школа № 41 мае мастацкі ўхіл, тым не менш яе навучэнцы ўжо не першы раз перамагаюць у рэспубліканскім турніры юных матэматыкаў. Можна меркаваць, што такіх вынікаў вучні дасягаюць, дзякуючы супрацоўніцтву школы з факультэтам прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ. Сярэбраных прызёраў сёлета таксама аказалася двое: ліцэісты з Санкт-Пецярбурга і Баранавіч. А трэцяе месца — у зборнай каманды двух гомельскіх школ.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Словы і справы

ДЗЕЦІ — НАША... ПЕСНЯ

«Страшная, але прыгожая» казка ад беларускіх артыстаў, Дзіцячага Фонду ААН ЮНІСЕФ і Біла Гейтса

Дарослыя любяць паўтараць прыгожыя фразы, маўляў, дзеці — наша будучыня, маладым паўсюль у нас дарога, увесь свет не каштуе слязінкі аднаго дзіцяці. А тым, што гэтыя лозунгі ўвасабляюцца ў жыццё, мы абавязаны арганізацыі, асноўнай задачай якой якраз і з'яўляецца прапаганда і абарона правоў дзяцей. Днямі, між іншым, Дзіцячы Фонд ААН ЮНІСЕФ адзначыў 60-годдзе з дня заснавання. З гэтай нагоды беларускі офіс арганізацыі не толькі прымаў віншаванні, але і сам зрабіў падарунак — каб выказаць любоў да ўсіх дзяцей Беларусі, вялікіх і маленькіх.

Канешне, прызнаюцца супрацоўнікі Дзіцячага Фонду ААН у Беларусі, нічога не атрымалася б, калі б не дабрачынная падтрымка агенцтва рознымі камерцыйнымі арганізацыямі. Напрыклад, беларускі сацыяльны праект «Калыханкі» спансіраваў... Біл Гейтс. Магчыма таму, што вельмі багатыя людзі могуць сабе дазволіць дабрачынныя ахвяраванні. Якраз сацыяльная рэклама, асабліва не адкрытая, а схаваная, дапамагае змагацца з праблемамі больш эфектыўна.

Скажам, у Бразіліі, вядомай раннімі і неўпарадкаванымі сэксуальнымі сувязямі, узнікла неабходнасць прапаганды прэзерватываў сярод падлеткаў. Замест банальных плакатаў у школах бразільцы знялі фарматны маладзёжны серыял, героі якога карысталіся прэзерватывамі. Эфект пераўзышоў усе чаканні! У расійскіх серыялах такім жа чынам «зашыфравана» барацьба супраць абортаў. Жанчыны нараджаюць, з мужам або без яго, — і ў выніку ўсё канчаецца добра.

Дзіцячы Фонд ААН ЮНІСЕФ у Беларусі на працягу многіх гадоў прапагандуе ўжыванне ёдаванай солі. Скажаце, дробязь? Але ў Беларусі прыродны ёдавы дэфіцыт і, як следства, аслаблены імунітэт і росквіт разнастайных хвароб, асабліва ў маладых маці і немаўлят. Таму на гэту тэму было зроблена некалькі сацыяльных ролікаў (памятаеце анімаваны заклік «дастаткова адной дробкі»?). Але на гэты раз да задачы выратавання было падысці творча і зрабіць — ні многа ні мала — казачны кліп на прыгожую песню. Такой песняй стала калыханка «Спі, мая кветачка», перакладзеная і дапрацаваная народная кампазіцыя. А выканала яе трыо Ларыса Грыбалёва—Тамара Лісіцкая—Ксенія Мінчанка, прычым Тамара і Ларыса — прыклады «правільных мамачак», у абедзвюх на двое дзяцей, і абедзве кармілі дзяцей грудзямі. Так што кліп атрымаўся прапагандысцкім па двух накірунках, што ў наш эгаізаваны і эмансіпаваны час зусім нялішне.

Сапраўды — калі ў сусветных зорак Шакіры, Анжэліны Джолі, Дэвіда Бэкхема «карона з галавы не падае» і яны ўдзельнічаюць у падобных праектах і абараняюць мацярынства і дзяцінства, то чым нашы беларускія зоркі горшыя?..

Кліп «Калыханка» напоўнены казачнымі персанажамі: анёл — абаронца ўсіх маці, троль — здабытчык солі, зачараваны прынц, чараўніца, русалкі, кот і трус. Прынц просіць у чараўніцы вычытаць з кнігі загадкавы рэцэпт, русалкі дзеляцца ёдам, кот раскідвае яго па солі, а трус перамешвае — і атрымліваецца ёдаваная соль, так неабходная ўсім беларусам... «Не ведаю, ці заснуць пад гэту калыханку дзеці, але спадзяюся, што дарослыя прачнуцца», — заўважыла Ларыса Грыбалёва. Дарэчы, падчас здымак у павільёне кінастудыі «Беларусьфільм» было раскідана без малога 800 кг солі, а спявачкі — у халодным памяшканні, на скразняку — стаялі на гэтай солі басанож. І тым не менш усе ўдзельнікі праекта працавалі з поўнай самаадданасцю, шчыра і абсалютна бясплатна. «А як жа інакш — мы вельмі рады далучыцца да падобнага праекта, бо мы мамы! І калі паклічуць яшчэ, з задавальненнем падпішамся», — смяецца Тамара Лісіцкая, якая дэбютавала ў «Калыханках» як спявачка.

Да слова, «Калыханкі» нездарма гучна названы праектам. Бо акрамя відэа сюды ўваходзіць цэлы дыск з 14 песнямі. Большасць з іх напісаў Зміцер Вайцюшкевіч у сааўтарстве з выдатнымі беларускімі паэтамі, старажытную яўрэйскую народную калыханку XVI—XVII стагоддзяў апрацаваў і выканаў Аляксандр Памідораў, «Куркурабушку» падарыў Юрый Выдрынак, а «Мільярды зорак» зрабіў гурт «Нео». Праца над запісам і афармленнем дыска ішла не адзін год, але, паверце, вынік таго варты — альбом «Калыханкі» выдадзены ў шыкоўным паліграфічным афармленні, дапоўнены кліпам, фотаздымкамі і інфармацыяй пра дзейнасць Дзіцячага Фонду ААН ЮНІСЕФ у Беларусі. Акрамя таго, прыкладна да праваслаўных Калядаў кампанія «АтлантТэлекам» плануе стварыць у Інтэрнэце спецыяльны партал www.lala.telecom.by (ад англ. «Lullaby» — калыханка), праз які песні зможа скачаць кожны жадаючы. Словам, беларускі праект абяцае стаць інтэрнацыянальным падарункам — а надалей аналагічныя дыскі рэгіянальныя офісы ЮНІСЕФ плануюць запісаць яшчэ як мінімум у Расіі і ва Украіне. «Без музыкі жыццё пустое, шэрае, а песні дадаюць колеру і радасці. Я памятаю, мой старэйшы сын першымі пасля слоў «мама», «тата» вывучыў «спявай» і «яшчэ», — прыгадаў Браніслаў Екіч, кіраўнік офіса Дзіцячага Фонду ААН ЮНІСЕФ у Беларусі. — Калі для дзіцяці спяваюць блізкія людзі — мама, тата, бабуля, — ён удвая шчаслівейшы. Дзякуй вам, што гэты праект атрымаўся менавіта такім».

— У вас хто? — спытаўся Браніслаў Екіч у Ларысы Грыбалёвай.

— Хлопчык і дзяўчынка, — з гонарам адказала спявачка.

— Выдатна. Працягвайце!

Спадар Екіч, які дагэтуль служыў у Арменіі і краінах Паўднёвай Азіі, у Беларусі працуе ўсяго трэці год, але паспеў ужо прыкіпець сэрцам да нашай краіны. І справа не толькі ў падабенстве моў (для Браніслава Екіча родная — сербская) і славянскіх менталітэтаў. Проста ён вельмі любіць сваю справу — і тых, хто займаецца абаронай правоў дзіцяці і маці ў Беларусі.

— У любой краіне свету ёсць праблемы з рэалізацыяй правоў дзіцяці. Я лічу, трэба двойчы падумаць, перш чым выкарыстоўваць дзяцей, іхнюю цікаўнасць, непасрэднасць, талент, іншыя якасці ў камерцыйных мэтах. Аднымі заканадаўчымі актамі гэту справу не вырашыш. Так, у законе ўсё цудоўна напісана. Але ці гатовыя мы як грамадства выканаць закон, ці зрабілі мы ўсё, каб дапамагчы дзецям? — гэтым рытарычным пытаннем кіраўнік беларускага офіса ЮНІСЕФ скончыў прэзентацыю праекта.

Удзельнікі «Калыханак» — артысты, паэты, мастакі, рэжысёры, каардынатары праграм ЮНІСЕФ — з чыстым сумленнем могуць даць станоўчы адказ, бо для іх дабрачыннасць не пачалася ўчора і не скончыцца заўтра. А для нас?

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Муз-news

«Naka» загналі ў «Катакомбы»

Канцэрт у сталічным клубе з такой назвай гурт дасць 15 снежня, прычым выступіць сумесна з вядомымі «дыверсантамі» — праектам «Разбітае сэрца пацана». Пікантнасць сітуацыі ў тым, што гітарыст «Naka» акцёр Дзяніс Тарасенка якраз з'яўляецца адным з гэтых «пацаноў», і за вечар яму давядзецца адыграць у абодвух калектывах.

Для салісткі Насці Шпакоўскай гэта выступленне таксама стане першым у новай якасці — мамы (у верасні яна нарадзіла сына Арсенія). «Думаю, на якасць гуку мой статус не паўплывае, хіба што на сэнсавую нагрузку, — жартуе Насця. — Мне хочацца, каб з цягам часу творчасць рабілася больш мудрай, шчырай і простай». Што маладая мама і кампанія прадставяць публіцы? Па-першае, вядомыя кампазіцыі з альбома «Табе», па-другое, новую песню «Спачуванне» і «самую прыгожую ў гэтым годзе» павольную баладу «Фабрыка зорак», напісаную паводле і пад уражаннем аднайменнага тэлепраекта.

«BeZ bileta» пачуюць безбілетнікі

Не раз і не два ўдзельнікі гурта чулі заўвагі ад прыхільнікаў, маўляў, з такой назвай — і пускаць на канцэрты па білетах. Нарэшце, у безбілетнікаў з'явіцца шанц трапіць на выступленні гурта «зайцам» — прычым цалкам афіцыйна. Першы падобны эксперымент пройдзе ўжо 22 снежня.

Бясплатныя запрашальнікі на калядны электрычны канцэрт атрымаюць два карыстальнікі «Жывога Журнала», падпісаныя на суполку beZ bileta. Жадаючым неабходна будзе хутчэй за астатніх пакінуць каментарый да запісу, які саліст гурта Віталік Артыст зробіць 16 снежня.

Дакладны час публікацыі, зразумела, трымаецца ў сакрэце. Дарэчы, колькасць безбілетнікаў і спосаб іх вызначэння для кожнага канцэрта гурта будуць мяняцца. Ну, а свядомыя асобы, якія ўсё ж набудуць білет, таксама не застануцца без сюрпрызаў: навагоднім падарункам кожнаму стане эксклюзіўны значок з сімволікай «beZ bileta». А білетаў у продажы, між іншым, роўна 222 — не больш і не менш.

Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

НЕПРАЦУЮЧАЯ МОЛАДЗЬ АБЫХОДЗІЦЦА ВЕЛЬМІ ДОРАГА

